
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета (Выходзіць з сакавіка 1990 г.) | № 46 (258) | 15 лістапада 1995 г. | Кошт — 500 рублёў

БІЛІНГВІЗМ У ЗША
Стар. 4.

ПРЫГОДЫ БЕЛАРУСА
Стар. 4 і 7.



СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ: СПАДЗЯЮСЯ НА МАЛАДОЕ ПАКАЛЕННЕ БЕЛАРУСАЎ
Стар. 2 і 3.

ПОСТУП ТЫДНЯ



❍ **ДА ПАЧАТКУ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ САВЕТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЗАСТАЛОСЯ ДВА ТЫДНІ.**

❍ ***ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫСТУПІЎ З ВІНШАВАЛЬНЫМІ СЛОВАМІ*** *ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы з нагоды сямідзесяцігоддзя гэтага тэатра. Выступаў па-беларуску. Гучала натуральна і нават успрымалася лепей беларуская мова з вуснаў Прэзідэнта, чым расійская.*

❍ **АДБЫЎСЯ СХОД 119 ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА XIII СКЛІКАННЯ.** Быў прыняты зварот да выбаршчыкаў.

❍ ***БЕЛАРУСКАЯ КАМАНДА КВЗ СУСТРАКАЛАСЯ Ў МАСКВЕ З КАМАНДАЙ ХАРКАВА І, НА ЖАЛЬ, ПРАІГРАЛА.*** *Балельшчыкі нашай каманды, як і раней, віталі яе бел-чырвона-белымі сцягамі.*

❍ **АДБЫЛАСЯ НАРАДА ДЫРЭКТАРАЎ ТЭАТРАЎ І КАНЦЭРТНЫХ УСТАНОЎ.** Перад прысутнымі выступіў намеснік міністра культуры і друку Уладзімір Рылатка. Ён, у прыватнасці, сказаў: «Напэўна трэба мяняць сістэму дзяржаўных датацый. Трэба перастаць займацца абаронай усяго, перастаць карміць калектывы, якія не нясуць творчага патэнцыялу. Магчыма, трэба праводзіць атэстацыю, якая творчая ініцыятыва вартая таго, каб быць падтрыманай дзяржаваю. У мастацтве павінна быць канкурэнцыя. А ў дзяржавы, паверце, хопіць разумення таго, што сваю культуру нацыя не павінна страціць...»

❍ ***СТАРШЫНЯ АБ'ЯДНАНАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПАРТЫІ СТАНІСЛАЎ БАГДАНКЕВІЧ У ГУТАРЦЫ З КАРЭСПАНДЭНТАМ «ЗВЯЗДЫ», УСПАМІНАЮЧЫ СВАЁ БАНКІРСТВА, СКАЗАЎ:*** *«Калі ўвесь народ думае, што там, у агульнай рублёвай зоне, шчасце... гатоў быў ісці на кампраміс. Аднак калі Кебіч і Мяснікові адчулі, што Расія не згодна пакінуць нам «суверэнныя» правы, яны сталі на пазіцыю Расіі, гатовы былі падпісаць усё. Я сказаў, што на гэта не пайду — выгады ніякай няма! У народа ўяўленне, што Расія — гэта былы СССР з рэжымам цэнтралізаванай эканомікі, што Чарнамырдзін дасць каманду — і нам адпусцяць за бесцань газ, нафту. Але ў Расіі ўсё дэцэнтралізавана, там мясцовыя шэйхі камандуюць — па якой цане і колькі...»*

❍ **У ГЭТЫМ ГОДЗЕ 7 ЛІСТАПАДА Ў НАШЫХ КАЛЕНДАРАХ**, як і пяць гадоў назад, пазначана чырвоным колерам. У Менску на плошчы Незалежнасці з гэтай нагоды адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі ў пераважнай большасці людзі пенсійнага ўзросту. У Расіі свята Кастрычніцкай рэвалюцыі камуністы адзначылі больш бурна. На мітынгах прагучала і абяцанне, што калі камуністы вернуцца да ўлады, то яны сваіх ворагаў адправяць у лагеры.

❍ ***ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!*** *Падпісная кампанія на перыядычныя выданні заканчваецца 30 лістапада. Калі вы яшчэ не падпісаліся на «Наша слова», але любіце нашу газету, раім гэта зрабіць неадкладна ў любым паштовым аддзяленні. Кошт падпіскі на адзін месяц — 3250 рублёў; на тры — 9750 рублёў і на шэсць — 19500 рублёў. Наш індэкс 63865.*

У абарону мовы ды гісторыі



Напярэдадні і пасля Дзядоў з ініцыятывы патрыятычнага руху БЗВ ладзілася пікетаванне рэзідэнцыі Прэзідэнта. Пад нацыянальным сцягам з патрабаваннямі «Спыніць русіфікацыю» ды «Абаронім нацыянальную гісторыю» пікетчыкі дэманстравалі сваю нязгоду з праводзімай сёння палітыкай знявагі беларускай мовы ды гісторыі.

Ці не пікет паўплываў на тое, што сваю прамову на юбілеі Купалаўскага тэатра Прэзідэнт прачытаў на мове беларусаў. І добра-такі прамаўляў па-беларуску.

М.АХРЫМУК.
Фота У.КАРМІЛКІНА.



Купалаўскаму тэатру — 75 гадоў

Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы — 75 гадоў. Дата, якая паказвае на творчую і жыццёвую сталасць... Колькі пераджыта за гэты час, колькі творчых адкрыццяў адбылося на сцэне, колькі «зорак» запалілася на ёй!

Першым мастацкім кіраўніком тэатра быў Ф.Ждановіч, першым спектаклем, якім адкрыўся тэатр, быў спектакль «Рысь» па аповесці «У зімовы вечар» Э.Ажэшкі. Здарылася гэта 14 верасня 1920 года. Сёння, як і ад пачатку свайго існавання, тэатр з'яўляецца захавальнікам нацыянальнай культуры, прадаўжальнікам традыцый нацыянальнай драматургіі...

Юбілейныя святкаванні адбыліся 1 лістапада. Да гэтага дня быў прымеркаваны «Фестываль сяброў» — многія тэатры, айчынныя і замежныя, прывезлі свае спектаклі ў падарунак нашаму гледачу . Сярод гасцей — акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа з Віцебска, драматычны тэатр імя Венгеркі з Беластока, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Івана Франко з Украіны, Летувіскі акадэмічны тэатр драмы...

На юбілейным вечары, 1 лістапада, што адбыўся ў памяшканні Нацыянальнага тэатра, прысутнічаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Ён зачытаў віншаванне калектыву тэатра ў сувязі з 75-годдзем заснавання. У віншаванні, у прыватнасці, гаворыцца: «Тэатр, які носіць імя вялікага беларускага песняра і з любоўю завецца ў народзе Купалаўскім, з'яўляецца гонарам нацыянальнай культуры і мастацтва. У гісторыі гэтага вядучага творчага калектыву Беларусі адлюстраваны амаль усе галоўныя працэсы духоўнага жыцця народа, яго складаны і цярністы шлях да волі і лепшага лёсу, спрадвечнае законнае жаданне «Людзьмі звацца»....

Прэзідэнт таксама запэўніў прысутных, што ведае праблемы беларускай культуры (якія ў асноўным тычацца яе хранічнага жабрацтва), і зробіць усё, каб «перацягнуць» творчую інтэлігенцыю на свой бок...

Рэдакцыя газеты «Наша слова» далучаецца да віншаванняў у адрас тэатра-юбіляра і жадае яму творчага плёну, творчых узлётаў, дабрабыту і — мужнасці ў адстойванні нацыянальнай культуры.

Л.Ш.

Творчасць нашых чытачоў

Дадому

Да роднага дому еду.
Трэба бацькоў адведаць.
З думкай імчу адзінай:
Там жа чакаюць сына.

Стрэне на дворышчы тата,
Прыветна запросіць у хату.
А там, пяшчотна, матуля,
Як у дзяцінстве прытуліць.

Пэўна пара змірыцца,
Такое не можа збыцца.
Узімку прыеду ці ўлетку,
Пакладу на магілы кветкі.

Веру

Важкім будзе наш колас
жытнёвы,
Васількі карагод павядуць.
Не загіне матуліна мова
І традыцыі зноў ажывуць.

Мілагучныя словы пальюцца,
Неба будзе над намі святлець.
Веру я, беларусы ачнуцца,
Беларусь яшчэ будзе квітнець!

Мікалай МАСКЕВІЧ.
м.Мядзел.

Наш індэкс — 63865

Працягваецца падпіска на першае паўгоддзе 1996 года.

Да 50-х угодкаў утварэння Саюза патрыётаў Беларусі

50 год таму ў лістападзе 1945 года адразу пасля спустошальнай для краіны вайны, зразумеўшы, што бальшавізм зноў узяўся за знішчэнне беларушчыны, у час страшнага камуністычнага таталітарызму і бязлітаснага тэрору, мы, нацыянальна свядомая моладзь з Пастаўскага і Глыбоцкага педагагічных вучылішчаў, аб'ядналіся ў «Саюз беларускіх патрыётаў», каб бараніць ад русіфікацыі нацыянальную школу, мову і культуру, бо сцярпець было немагчыма той знявагі і гвалту, што чыніліся над усім беларускім. З-за слабай сувязі мы толькі цьмяна чулі, што гэтак жа адбывалася і ў іншых навучальных установах на Беларусі. Наша арганізацыя была чыста асветніцкая. Многія з нас яшчэ не дасягнулі нават паўналецця. Мы не ведалі, што за чыстую любоў да сваёй краіны, за жаданне вучыцца на роднай мове нас пакараюць так сурова. Хоць арганізацыя лічылася падпольнай, але канспірацыя была вельмі слабай, і ў 1947 годзе пачалася над намі жорсткая і бесчалавечная расправа. Многіх заняволілі і сагналі ў ГУЛАГ на доўгія тэрміны, а чатырох нашых хлопцаў прысудзілі да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу, замяніўшы потым прысуд на 25 год лагераў.

Так у нас забралі маладосць, знявечылі жыццё, і мы, хто не памёр ад жудасных умоў, сталелі і набіраліся розуму не за школьнай партай, не ва універсітэтах, а на катарзе.

Праміналі многія гады. Мы, хто яшчэ жывыя, ужо старыя, нямоглыя, хворыя і з незажыўшымі ранамі ад мінулага. Але мы засталіся патрыётамі Беларусі і любім свой народ па-ранейшаму. Таму нас не пакідае трывога за лёс нашай Радзімы. Тым не менш, мы жывём надзеяй, што калі не самі, то нашы дзеці і маладыя суайчыннікі дажывуць да часу сапраўднай незалежнасці і свабоды роднай Беларусі.

Верым: наша самаахвярнасць не была марнай.

Карыстаючыся нагодай, звяртаемся да сяброў па змаганні, па няволі і пакутах за Беларусь са словамі прывітання.

Пачуйце наш голас, хто яшчэ жывы, дзе б хто ні знаходзіўся, — аб'яднаемся душой, у думках у гэтыя дні юбілею. Разам памянём, ушануем памяць тых, каго ўжо не стала, хто заўчасна сышоў у дол, і тых, хто ляжыць безыменным у вечнай мерзлаце Сібіры і Поўначы і іншых мясцінах страшнага бальшавіцкага ГУЛАГа.

Жыве Беларусь!

Антон ФУРС, сябра Глыбоцкай групы СПБ.
Аляксандра УМПІРОВІЧ (Фурс), сябра Пастаўскай групы СПБ.

Спадзяюся на маладое

З народным дэпутатам Вярхоўнага Савета РБ, доктарам тэхнічных навук, прафесарам, членам-карэспандэнтам АН Беларусі, заслужаным дзеячам навукі і тэхнікі Станіславам Шушкевічам гутарыць карэспандэнт «Нашага слова». Інтэрв'ю запісана 6 кастрычніка, на IV з'ездзе ТБМ імя Ф.Скарыны.

— Станіслаў Станіслававіч, па рэакцыі залы я ўбачыла і Вы, мабыць, заўважылі, што дэлегаты з'езда прывіталі Вас вельмі цёпла. Усім вядома, колькі Вы зрабілі добрага дзеля адраджэння беларускай культуры на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. А цяпер скажыце, калі ласка, якое ў Вас склалася ўражанне ад з'езда?

— Мне прыемна пачуць ад Вас гэтыя словы і бачыць прыязную рэакцыю дэлегатаў. У мяне такое адчуванне, што я абавязаны зрабіць нешта большае за тое, што мы ўсе разам зрабілі, занепакоеныя за лёс мовы. Мне спадабалася тое, што на з'ездзе не было жорсткай крытыкі і аналізу памылак, а занепакоенасць тым, што трэба рабіць. Я маю пункт гледжання, які крыху адрозніваецца ад таго, што быў выказаны. Я знарок не ўступаў у дыскусію, а хацеў паслухаць. А вам магу сказаць для газеты: культуры не могуць супрацьстаяць адна адной і элементы культуры і мовы таксама не могуць супрацьстаяць. І быць перакананым у тым, што беларускамоўныя школы — гэта лепшая адукацыя, чым, напрыклад, рускамоўныя, — гэта толькі адзін бок праблемы. Трэба, каб рускамоўнае асяроддзе, рускамоўныя школы Беларусі, якія не па сваёй волі, а па накіраванай ганебнай дзейнасці іншых людзей страцілі здольнасць гаварыць і працаваць на роднай мове, усвядомілі, прадстаўнікамі якой нацыі яны з'яўляюцца, якой даўняй культуры. Прапаганда дасягненняў — не толькі тых, якія мы мелі ў мінулым, не толькі з-пад часу бітвы пад Оршай або з-пад часу стварэння нашага універсітэта, які ўзнік раней на 150 гадоў за Маскоўскі, а і з нядаўняга мінулага, напрыклад, з-пад часу Вялікай Айчыннай вайны, была б зараз вельмі дарэчы. Я нядаўна ехаў са сваёй даверанай у мінулым асобай па выбарах, і гэты чалавек мне гаворыць: «Ці ведаеце Вы, што сярод чатырох танкістаў двойчы Герояў Савецкага Саюза — трое беларусаў? Што, напрыклад, Герой Савецкага Саюза, які найбольш збіў нямецкіх самалётаў у адным баі, — беларус?» І такіх прыкладаў шмат. Напрыклад, Тадэвуш Касцюшка пісаў сваёй маці лісты па-беларуску — пра гэта ж проста люд не ведае. Павінен быць нейкі катэхізіс сучаснага свядомага беларуса. І мне здаецца, што вельмі важная задача ТБМ займацца не толькі беларускай мовай, але і культурай у цэлым.

— Вам прапаноўвалі пасаду старшыні ТБМ?

— Ведаеце, я хачу пераканаць Ніла Гілевіча заставацца і надалей старшынёй Таварыства. Гэта чалавек, шчыра адданы беларускасці. Я ў гэтым пераканаўся, працуючы з ім разам у Вярхоўным Савеце і за сорак пяць гадоў асабістага знаёмства. А што да арганізацыйнай дапамогі, то я да гэтай справы заўсёды гатовы.

— Скажыце, калі ласка, Станіслаў Станіслававіч, якую палітычную сілу Вы сёння прадстаўляеце?

— Ведаеце, каб не заездзіць гэты выраз «здаровы сэнс», то я спаслаўся б толькі на здаровы сэнс, і магу растлумачыць чаму. У Беларусі многа партый, якія маюць праграмы, да якіх я далучыўся б. І больш за ўсё мае перакананні адпавядаюць падыходу Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады. Я не раз гаварыў, што па перакананнях я — грамадовец. Але пэўныя канкрэтныя дзеянні і пэўныя канкрэтныя захады нават гэтай партыі, якая мне бліжэй за ўсё іншыя па перакананнях, абавязваюць мяне проста ўстрымацца ад таго, каб у яе ўступіць. Я б сказаў, — у першую чаргу, каб не сапсаваць справы ў самой партыі. Таму што я буду тады рашуча выступаць супраць некаторых людзей персанальна і супраць некаторых падыходаў. І такім чынам пашкоджу справе гэтай палітычнай арганізацыі, якую вельмі паважаю. Таму я цяпер, прабачце, па-за партыямі. Мая палітычная арыентацыя — гэта, перш-наперш, беларуская дзяржаўнасць, рынкавая эканоміка, сацыяльная забяспечанасць і, зразумела, дэмакратыя, паколькі нішто з вышэй пералічанага не можа быць рэалізавана ў сучасным кантэксце без дэмакратыі.

— А вось гэтая палітычная ініцыятыва «Усход—Захад», як Вы да яе ставіцеся?

— Зараз, на жаль, шэраг палітычных ініцыятыў у нас накіраваны не на тое, каб зацвердзіць беларускую дзяржаўнасць, каб спрыяць пераходу да новых эканамічных адносін, а на тое, каб паказаць сябе на фоне беларускага беспарадку, на фоне сучаснай



беларускай мітусні. І таму я вельмі стрымана стаўлюся да ўсіх «круглых сталоў», таму што — падкрэсліваю: там вельмі часта абмяркоўваецца не сутнасць справы, а чалавек паказвае, як ён можа на цудоўнай беларускай або рускай мовах шалёна крытыкаваць сваіх апанентаў. А я хачу распрацоўваць канструктыўны пачатак, стваральны пачатак, а не разбуральны.

— Скажыце, калі ласка, як ідуць справы ў Цэнтры палітычных і эканамічных даследаванняў, які Вы ўзначальваеце?

— Я б сказаў, што яны ідуць па-ранейшаму, паколькі Цэнтр працуе ўжо амаль два гады. Гэта не дзяржаўная ўстанова. Яна функцыянуе толькі дзякуючы беларускім прадпрымальнікам і беларускім структурам, якія робяць у нас пэўныя заказы і атрымліваюць справаздачу ў выглядзе канфідэнцыяльнай інфармацыі. Акрамя таго, калі нашы заказчыкі не маюць нічога супраць, шэраг пазіцый мы даём для друку. Мы маем адну супольную тэму з навукоўцамі Германіі і дзякуючы гэтаму маем поўнае абсталяванне ў нашым Цэнтры: вылічальную тэхніку, капіравальную тэхніку і стварылі даволі-такі ёмістую кампутарную базу афіцыйных дадзеных. Яны фактычна атрыманы ў нашым урадзе, у Вярхоўным Савеце, з іншых афіцыйных крыніц. Але мы праводзім такі аналіз і такія зрэзы гэтых дадзеных, якія дазваляюць простаму чалавеку разабрацца, што адбываецца ў дзяржаве і ў якім накірунку мы рухаемся. Так што я яшчэ раз паўтараю: ідэя заказчыкаў, сур'ёзныя адказы і папулярызацыя ў звычайных сродках масавай інфармацыі, калі мы маем туды доступ.

— Прабачце за некарэктнае пытанне: хто Вам плаціць заработную плату?

— Мы не налічваем з тых сродкаў, якія выплачваюць заказчыкі за выкананую намі работу. Я б сказаў, што мы плацім і заработную плату, і даволі-такі вялікія падаткі. Хачу сказаць, што я асабіста з 1 жніўня г.г. зарплату не атрымліваю, каб не рызыкаваць пенсіяй на падставе якога-небудзь незаконнага ўказа. На жаль, як вы ведаеце, у нас гэта магчыма.

— Вернемся да Вашых дэпутацкіх спраў. Станіслаў Станіслававіч, як цяпер настроены Вярхоўны Савет?

— Як і заўсёды: застаўся такі самы, як і быў. Раней у яго быў страх ад жнівеньскага путчу 1991 года, а цяпер страх ад Прэзідэнта. І таму многія дэпутаты поўзаюць на пузе, каб залагодзіць Аляксандра Рыгоравіча. Не ўсе, вядома, а тыя, што не прыехалі на сесію.

— Значыць, супрацьстаянне антыбеларускай палітыцы нашага ўрада ў Вярхоўным Савеце мы не маем?

— Вярхоўны Савет ніколі не быў беларускім. Але ён быў вымушаны пайсці насустрач беларускасці, таму што Дэкларацыя аб незалежнасці адкрыла многім дэпутатам шлях да вядомасці, да пасад, якія не трэба было ўзгадняць з Масквой.

— І нават пры ўсім тым, што Прэзідэнт так дрэнна ставіцца да заканадаўчага органа, дэпутаты ўсё роўна не «правеюць»?

— Гэта вельмі складанае пытанне — яно для «круглага стала» па палітычных праблемах. Справа ў тым, што 80 працэнтаў дэпутатаў у гэты Вярхоўны Савет накіравана былой камуністычнай партыяй. Час ад часу яны пра гэта забываюць, а час ад часу ўспамінаюць. І тады яны, усе гэтыя 80 працэнтаў, галасуюць, каб аднавіць свята Кастрычніцкай рэвалюцыі, каб развітацца з беларускай сімволікай і мовай, каб правесці антыбеларускі рэферэндум.

— Калі мы ўжо закранулі пытанне рэферэндуму, то скажыце, ці была магчымасць у Старшыні парламента Мечыслава Грыба не дапусціць правядзення гэтай спрэчнай, з пункту гледжання існуючых законаў, акцыі?

— Сёння Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь вельмі прыгожа выступіў у абарону беларускай мовы. А гэта ж з-за яго паслужлівасці адбыўся рэферэндум, бо першапачаткова Вярхоўны Савет галасаваннем усе пытанні Прэзідэнта да рэферэндуму адхіліў. І не трэба было выслужвацца і ставіць гэтыя пытанні на галасаванне паўторна. Дык тады спадар Грыб забыўся, што ён беларускамоўны, а сёння пра гэта ўспомніў. На жаль, такая трансфармацыя адбылася з ім і тады, калі вырашалася пытанне калектыўнай бяспекі.

— Станіслаў Станіслававіч, Вы ўдзельнічаеце ў выбарчым марафоне? Ад якой партыі?

— Удзельнічаю. Вылучаюся як незалежны кандыдат. У мяне ёсць ініцыятыўная група прыхільнікаў. У нас адсутнічае дыктат, кожны вольны гаварыць тое, што разумее і думае, а таксама вольны падпарадкоўвацца тым правілам, якія мы сфармулявалі разам. Спадзяюся, што мае прыхільнікі збяруць неабходную колькасць подпісаў і я буду балатавацца на маёй былой 256-й Адоеўскай выбарчай акрузе.

— Якая Ваша выбарчая праграма?

— Мая праграма застаецца ранейшай, той самай, з якой я ішоў на прэзідэнцкія выбары.

ЖЫЦЦЁ ТАВАРЫСТВА

Расонскі палетак

Раённая арганізацыя ТБМ імя Ф.Скарыны налічвае 35 чалавек. Гэта пераважна настаўнікі роднай мовы і літаратуры. Яны рупяцца не толькі пра адраджэнне і захаванне нацыянальных і гісторыка-культурных каштоўнасцей ды выхаванне моладзі на лепшых традыцыях беларускага народа, але і спрыяюць працэсу беларусізацыі. З 15 агульнаадукацыйных школ раёна — 13 беларускамоўных. Расонская і Альбрэхтаўская СШ — двухмоўныя (так засталося і пасля рэферэндуму): летась быў адзін першы расійскамоўны клас ды 6 беларускіх класаў, а сёлета з 6 першых класаў — адзін беларускамоўны. У вясковых школах усе першыя класы беларускамоўныя. Усе дашкольныя ўстановы раёна пераведзены на беларускую мову навучання і выхавання.

• Штогод у школах з удзелам сяброў ТБМ праводзяцца тыдні беларускай мовы, у праграмах якіх — канферэнцыі па прачытаных кнігах, віктарыны, КВЗ, дыспуты, розныя конкурсы, літаратурныя вечары, гасцёўні. У школах і дашкольных установах ладзяцца народныя абрадавыя святы, гутаркі, лекцыі пра мінулае Беларусі, вусныя часопісы «Беларусь мая сінявокая», «Край блакітных азёр».

У Альбрэхтаўскай і Расонскай школах створаны сяброўствы малодшых школьнікаў «Васількі» і «Крынічкі», якія працуюць пад дэвізам «Мы павінны ведаць мінулае, твой сённяшні дзень, Беларусь». У праграме дзейнасці гэтых суполак — вывучэнне гісторыі і помнікаў Беларусі, Расоншчыны.

У Доме школьніка працуюць гурткі «Інкрустацыя саломкай», «Спадчына», «Мастацкая вышыўка». Штогод праводзяцца агляды фальклорных калектываў, якія ёсць практычна ў кожнай школе.

У раёне працуе вакальна-харэаграфічны ансамбль «Свяціца», які ў траўні 1994 года атрымаў званне народнага і ў склад якога ўваходзяць школьнікі і старэйшыя людзі розных прафесій. Некалькі разоў у год праходзяць выставы народных умельцаў. Створаны і працуюць этнаграфічны музей у Заборскай СШ, этнаграфічныя куткі ў Расонскай, Клясціцкай сярэдніх школах.

Школьныя бібліятэкі прапагандуюць творы беларускіх пісьменнікаў, праводзяць выставы, канферэнцыі.

Інфармацыя падрыхтаваная па матэрыялах справаздачы, дасланай у Сакратарыят ТБМ напярэдадні IV з'езда.

Я ўжо казаў, што я за беларускую дзяржаўнасць, дэмакратычны шлях развіцця грамадства, рынак і сацыяльную абароненасць людзей. Аднак відавочна, што шараговых выбаршчыкаў, працаўнікоў, якія слаба арыентуюцца ў палітыцы і якім усё жыццё казалі, каб яны толькі працавалі, а астатняе зробіць за іх дзяржава, заклікаць сёння да актыўнага ўдзелу ў перабудове грамадства будзе недарэчным. Гэта тое самае, што гаварыць лекару з пацыентамі на спецыфічнай мове медыцынскага падручніка. Змест маёй праграмы тлумачыцца вельмі проста: **я хацеў бы ўсё зрабіць дзеля таго, каб грамадзянін Беларусі меў усе падставы быць здаровым і шчаслівым чалавекам і не баяцца за свой заўтрашні дзень і лёс сваёй сям'і. Такім чынам я стаю за дом, за шчаслівую сям'ю, за дабрабыт і здароўе простага чалавека.** І калі б мы ўсе, беларуская палітыкі, пайшлі такім шляхам, то і наш выбаршчык зразумеў бы, што яго грамадская такі кур'ёзны факт: у Менску 5 працэнтаў нацыянальнага багацця належыць прыватным уласнікам, а 95 працэнтаў — дзяржаўным прадпрыемствам. А паглядзіце, што робіцца з падаткамі: больш за 50 працэнтаў усіх падаткаў плацяць у гарадскі бюджэт прыватнікі, астатнюю ж долю ўносяць дзяржаўныя прадпрыемствы. Выходзіць, што дзяржава корміць тых, хто кепска, нерэнтабельна працуе. Пакуль народная гаспадарка не стане на разумную эканамічную аснову, датуль рэальных перспектыў выхаду з крызіснага становішча мы не ўбачым. Я скажу так: у беларускіх умовах трэба пайсці па шляху Чэхіі, Венгрыі, Польшчы, і ў пэўнай ступені, па шляху краін Прыбалтыкі.

— Станіслаў Станіслававіч, чым адрозніваецца сённяшняя беларуская дзяржаўная сістэма ад учарашняй, так званай сацыялістычнай?

— Старая сістэма функцыянавала па пэўных правілах, якія час ад часу змяняліся воляй

пакаленне беларусаў

актыўнасць спрыяе ўласнаму дабрабыту, спрыяе стабілізацыі яго сям'і, дае яму шанц мець свой дом. Заўважу: на падставе тых падыходаў, якія распрацоўвае прэзідэнцкая вертыкаль, зрабіць такое для чалавека немагчыма. Сёлета наша рэспубліка збяднела на 12 працэнтаў валавага нацыянальнага прадукта. Людзі збяднелі значна больш, таму што значна павялічыліся выдаткі на дзяржаўны апарат.

— Гэта азначае, што пры такім раскладзе сіл, які мы зараз маем, становішча ў дзяржаве не выправіцца?

— Бессэнсоўна спадзявацца на сумленнасць прэзідэнцкай каманды і заклікаць яе да захавання нейкіх там этычных або чалавечых норм паводзін. Бо каманда, якая не шануе беларушчыну, не разумее, што мова народа — гэта яго душа, не разумее і патрэбы народа. Таму яна і ізалявала народ ад іншадумцаў. Прэзідэнцкая каманда ўзяла ў свае рукі сродкі масавай інфармацыі значна больш жорстка, чым у свой час гэта рабіла камуністычная партыя. Таму я сёння як кандыдат у дэпутаты ВС магу толькі спадзявацца, прабачце, на самаахвярнасць сваіх прыхільнікаў, якія збіраюць подпісы ў маю падтрымку і тлумачаць мае пазіцыі. Свае падыходы я выклаў не на **вушка каму-небудзь, а на сесіі** Вярхоўнага Савета. І таму, што сёння мы не ідзём па шляху пераўтварэнняў, мы ідзём да бядоты.

— Сваю праграму, памятаецца, Вы выклалі ў парламенце дзесьці ў сярэдзіне дзевяноста трэцяга года?

— Дакладней, у кастрычніку дзевяноста трэцяга. Але гэтая шырокая праграма зусім не спадабалася большасці Вярхоўнага Савета. Яна не магла спадабацца тым, хто пры ўладзе і пры пасадзе, таму што большасць гэтых пасад грамадству не патрэбна. У нас захаваліся старыя адносіны да ўласнасці. Да гэтага часу ў калгасе людзі працуюць на нічыйнай зямлі, а ў горадзе — на нічыйным заводзе. А плады іх працы размяркоўваюць бюракраты-чыноўнікі. Дык чаму ж не зрабіць так, каб заводы сапраўды былі ў рабочых, а зямля — у сялян і ва ўсіх тых, хто там працуе? Зараз у нас усё належыць дзяржаве, а працоўны чалавек існуе як бы пры прыгонным праве. Свет даўно ўсвядоміў, што гора не ад прыватнай уласнасці, а ад яе адсутнасці. У краінах, якія пайшлі натуральным шляхам развіцця, 60-70 працэнтаў насельніцтва з'яўляецца ўласнікамі ўсяго таго, што ёсць у дзяржаве. Я не заклікаю разбураць усе калгасы і ліквідоўваць усю дзяржаўную прамысловасць, але нельга, каб імі кіравалі міністры і многія тысячы бюракратаў і з такім нізкім эфектам. Мы павінны змяніць адносіны да прыватнай уласнасці, аб якой сведчыць ЦК КПСС і воляй палітбюро ЦК КПСС. Яна абапіралася пераважна на адукаваных і падрыхтаваных у той або іншай галіне народнай гаспадаркі людзей, якія былі вывучаны ў ВПШ і ў акадэміях кіравання. Гэтыя людзі ведалі, прыкладам, што такое дзяржаўны план. Кандыдатуры кіраўнікоў узгадняліся, абмяркоўваліся, зацвярджаліся. Сённяшняя беларуская сістэма імкнецца функцыянаваць па тых самых правілах, што і старая, аднак яна абапіраецца ў значнай ступені на невукаў і людзей некампетэнтных. Чыноўнік дае парады, як пісаць сачыненне, калі сам ён ніколі людскага сачынення не напісаў. Ён кіруе міністэрствам, не маючы аб яго дзейнасці адпаведнага ўяўлення. У галіне культуры «праўду» гісторыі такі кіраўнік бачыць у тым, што Беларусь быццам бы складае адзіны маналіт з Расіяй. Спецы ад нашай культуры ведаюць беларускую гісторыю з «Кароткага курса КПСС». Сёння невук у нашай дзяржаве можа быць прызначаны і на пасаду міністра, і на пасаду намесніка прэм'ер-міністра.

— Наша дзяржава разлічана на ўзаемадзеянне трох галін улад — выканаўчай, заканадаўчай і судовай. Аднак у апошні час многае змянілася, і ўлада апынулася фактычна ў адных руках. Якія гарантыі, што Канстытуцыя ў такім разе будзе захоўвацца?

— У дадзенай сітуацыі сапраўды выканаўчая ўлада мае магчымасць беспакарана парушаць Асноўны закон і дзейнічаць па прымаўцы: «Закон што дышла...» І ўсё ж будзем спадзявацца, што ў будучым заканадаўчая і судовая галіны ўладаў ураўнаважаць прэзідэнцкую і дзяржава пазбегне катастрофы. Магчыма, той-сёй уцяміць нарэшце, што каб зрабіць штосьці добрае, аднаго жадання мала, патрэбна яшчэ і ўменне. Спадзяюся, што фарміраванне ўрада прафесіяналаў у будучым адбудзецца.

— Станіслаў Станіслававіч, мяркуючы па Вашай дзейнасці ўжо пасля адстаўкі з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета і па Вашых выступленнях у друку, складваецца ўражанне, што Вы застаецеся аптымістам. Скажыце, а ў якім святле Вы прагназуеце нашу будучыню?

— Сапраўды, я застаюся аптымістам. А што ўсяляе ў мяне найвялікшы аптымізм, дык гэта моладзь. Калі я бачу, як ідзе яна натоўпам са стадыёна з бел-чырвона-белымі сцягамі або скандуе «Жыве Беларусь!» у электрычцы, або як яна ўзнімае гістарычную сімволіку ў зале, дзе гуляе беларуская каманда вясёлых і знаходлівых, у сэрцы расце перакананне, што Беларусь будзе жыць.

Ірына КРЭНЬ.

ЖЫЦЦЁ ТАВАРЫСТВА

Весткі з Віленшчыны

У вёсцы Кавальчукі Віленскага раёна (ст. Кена) створана суполка Таварыства беларускай мовы. Кіраўнікамі яе з'яўляюцца настаўнік-пенсіянер сп. Аляксандр Юрасёў, мастак Ян Навіцкі. У мясцовай бібліятэцы створаны Куток ТБМ, дзе ёсць добрая літаратура на беларускай мове. А днямі пачынае працаваць таксама гурток па вывучэнні роднай мовы для дзяцей тутэйшых беларусаў. Трэба яшчэ зазначыць, што між ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага краю і аддзелам культуры Віленскага раёна ўвогуле ўсталяваліся плённыя сувязі ў справе адраджэння беларушчыны. З яго дапамогай паддзяца добрыя культурныя ўзаемадачыненні беларусаў з Летувы з суродзічамі, што жывуць у Докшыцкім раёне. Ідзе актыўная падрыхтоўка да фэсту беларускай песні.

На жаль, аддзел культуры Докшыцкага раёна не дужа імкнецца да такіх сумесных дзеянняў. Відаць, чакаюць каманды зверху. Затое простыя людзі вельмі зацікаўленыя ў сумесных культурных дзеях.

Алея продкаў

Напярэдадні восеньскіх «Дзядоў» віленскія беларусы сумесна са сваімі суродзічамі з Докшыцкага раёна пасадзілі Алею продкаў. Асабліва стараліся сябры ТБМ Антон і яго сын Лёнік Падляшчукі, Уладзімір Гуменнік, Іван Варэнька, Марта і Ядзя Падляшчукі, Раман Шворань, Антон Маховіч ды іншыя. Устаўлены тут і Крыж Адраджэння Беларусі, які асвяціў ксёндз мясцовага Параф 'янаўскага касцёла айцец Тадэвуш.

Юрась ГІЛЬ, адказны сакратар ТБМ Віленскага краю.

Навучыць прыгажосці

Уражанні ад наведвання Цэнтра эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў г. Маладзечна

У Маладзечна мы трапілі дзякуючы запрашэнню выступіць у тамтэйшым Цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў. Сустрэў нас «Горад Сонца» бляклым небам, восеньскім даждж ом і пранізлівым ветрам.

— А ніякага «Горада Сонца» не існавала, — сказаў супрацоўнік Цэнтра, які сустрэў нас на вакзале, і, на наша здзіўленне, патлумачыў: — Гэта ўсё журналісцкая прыдумка, быццам наш былы мэр Генадзь Карпенка паабяцаў зрабіць Маладзечна «Горадам Сонца»... Словы падхапілі і растыражыравалі, хаця сам Карпенка быў гэтым не задаволены...

Гісторыя ўвесь час адводзіла Маладзечну «правінцыйную» ролю, з другога боку, час ад часу ўзнікалі прэтэнзіі на ролю, куды больш значную... Вось і цяпер — гістарычных будынкаў амаль няма, затое ёсць велізарны добраўпарадкаваны стадыён, дзе, дарэчы, праводзіўся разрэкламаваны фестываль «Маладзечна-93», дыхтоўны будынак Менскага абласнога тэатра, сучасны вакзал... Увогуле, як я пачула, Маладзечна «створанае» Лібава-Роменскай чыгункай... Але будынак, у якім змяшчаецца Цэнтр эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў, аказаўся незвычайным, менавіта гістарычным — двухпавярховы маёнтак, акружаны старымі дрэвамі дагледжанага парка...

— Так, тут сапраўды быў некалі панскі маёнтак, — патлумачыла Тацця на Сцяпанаўна Чаброўская, дырэктар Цэнтра. — Пасля ўсталявання савецкай улады гэты будынак быў аддадзены знакамітаму Сяргею Прытыцкаму — ён жыў тут з сям'ёй. Да нядаўняга часу знаходзіўся тут дзіцячы садок — адчуваеце, як моцна грэюць у нас батарэі? Задуха! Але ў садку было мала дзетак, яго расфармавалі і намерваліся тут змясціць скурвендыспансер... Ды жыхары навакольных дамоў узбунтаваліся, сабралі подпісы, і ўрэшце будынак аддалі нам. Бо наш Цэнтр ужо даўно стаяў «у чарзе» на сваё памяшканне, і на старым месцы, пры бібліятэцы, мы проста «задыхаліся»...

А працу Цэнтр робіць вялікую — у гэтым я пераканалася, пабачыўшы расклад заняткаў Цэнтра — тут і гурток фларыстыкі, і тэатральны гурток, і ізастудыя, і клуб аматараў турысцкай песні, і клуб «Гарэза», і батлейка, і, канешне, шматлікія мерапрыемствы, заснаваныя на народных традыцыях, фальклоры... Прычым, праца Цэнтра з'яўляецца аднача сова і доследнай — зразумела, шмат у чым яго супрацоўнікі даводзіцца абапірацца толькі на ўласны вопыт ды інтуіцыю.

Як я зразумела, адна з галоўных задач Цэнтра — праводзіць для школьнікаў урокі эстэтычнага выхавання... «Іх цяжка назваць урокамі, — адзначыла Тацця на Сцяпанаўна. — Хутчэй гэта святы. Напрыклад, сустрэча вясны, Каляды...»

Так, галоўныя мерапрыемствы, якія ладзіць Цэнтр, — правядзенне народных святаў, грунтуюцца па каляндарна-абрадавым цыкле з паказальнымі сезоннымі святкаваннямі. Святы адбываюцца не толькі ў межах Цэнтра ці нейкай школы — яны агульнагарадскія, праходзяць на вуліцах, у зале, на паляне, ля ракі.

Напрыклад, мінулагодняе свята «Восеньскі кірмаш» адбывалася ў парку. Шмат гледачоў сабрала тэатралізаваная гульня «Гандаль» у выкананні дзяцей. Быў і кірмашны аўкцыён прыпевак, песень, загадак і танцаў. Спадабалася ўсім гульнёва-забаўляльная праграма «Талака ў бабкі Агапкі», якой завяршылася свята... На Каляды дзеці калядавалі па класах, адбыўся і навагодні баль-маскарад «Навагоднія цуды». А вось святкаванне Масленіцы пад назвай «Зіма з вясной стрэчаюцца ды з Масленіцай вітаюцца» мела спартыўны характар... Кожную вясну ў парку праходзіць «Гуканне вясны», ля ракі ладзяцца купальскія святы... Вывучаюць дзеці і гісторыю беларускага нацыянальнага тэатра, і гісторыю лялечнага тэатра. Прычым, усё гэта на практычных занятках, у працэсе гульні... Адводзіцца вялікае месца і знаёмству з музыкай, з музычнымі інструментамі. На занятках Цэнтра эстэтычнага выхавання вывучаецца таксама гісторыя нацыянальнага касцюма, даецца паняцце пра эстэтыку знешняга выгляду...

На маё пытанне, як у Цэнтры справы з беларускай мовай, Тацця на Сцяпанаўна запэўніла, што заняткі праводзяцца на беларускай мове. Канешне, не ўсе супрацоўнікі Цэнтра, калі ўладкоўваюцца сюды на працу, добра валодаюць мовай. Але пры жаданні і агульнай «устаноўцы» авалодаць ёю можна заўсёды... Што тычыцца «заказчыкаў», школ, дзе Цэнтр праводзіць заняткі, дык ніякіх прэтэнзій з прычыны іх беларускамоўнасці не было...

Увогуле, на мой погляд, у Маладзечне становішча беларускай мовы куды больш трывалае, чым у Менску. Прынамсі, яе чуваць паўсюль — няхай пачасту ў «трасяначным» варыянце...

Ёсць яшчэ адзін аспект дзейнасці Цэнтра, пра які згадала Тацця на Сцяпанаўна, — гэта праца з падлеткамі. Яна мае сваю спецыфіку, звязаную з праблемамі «пераходнага» ўзросту. Але ў Цэнтры знаходзяць падход да кожнага. Таму сведчанне — надзвычайная папулярнасць клуба «Гарэза» — клуба гульні, дзе дзеці ўдзельнічаюць у гульнях па тыпу знакамітых «Поля цудаў» і КВЗ. Дарэчы, гульні КВЗ адбываюцца настолькі цікава, што залы, у якіх яны праходзяць, не змяшчаюць гледачоў... Напрыклад, на апошнюю гульню КВЗ давялося нават распаўсюджваць білеты, а падчас самой гульні хапала працы для міліцыі — утаймоўваць тых, каму не пашанцавала трапіць у залу... Вялікай папулярнасцю карыстаюцца таксама конкурсы юных талентаў. Прычым, Тацця на Сцяпанаўна выказала думку, што супрацоўнікі Цэнтра бачаць сваю задачу не толькі ў тым, каб выхоўваць згаданыя юныя таленты, але і ў тым, каб выхоўваць гледача. Бо, на жаль, глядацкая культура сёння вельмі нізкая, і класічныя творы нават у выкананні дзяцей не выклікаюць разумення...

Так, Цэнтр эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў горада Маладзечна вядзе цікавую, разнастайную і карысную работу. Можа быць, у сённяшніх цяжкіх эканамічных варунках ён мог бы перайсці на самафінансаванне?

— Што ж, — кажа Тацця на Сцяпанаўна, — мы маглі б зрабіць платнай частку сваіх мерапрыемстваў — напрыклад, клуба «Гарэза». Але гэта прывяло б да таго, што не ўсе дзеці змаглі б наведваць гэтыя мерапрыемствы... Хіба можна пайсці на такое, калі некаторыя школьнікі, па водгуках выкладчыкаў, літаральна галадаюць?

Так, Цэнтр існуе для ўсіх дзяцей. І не толькі Маладзечна, але і навакольных вёсак... Далучэнне да нацыянальнай культуры, эстэтычнае выхаванне дзяцей, адкрыццё дзеля іх духоўных каштоўнасцей — такая праца заслугоўвае бясконцай павагі і ўдзячнасці...

Мы пакідалі Маладзечна, калі ўжо сцямнела. У прывакзальным кіёску Саюздруку ляжаў апошні нумар «Нашага слова»...

Бывай, міфічны «Горад Сонца»! Усё-такі сонца ў цябе ёсць — духоўнасці і дабрыні.

Л. ШНІП.

Згадкі

Жыццёвыя прыгоды простага беларуса

Я пражыў доўгае жыццё і з вышыні пражытых гадоў магу сказаць адназначна: ва ўсе часы і пры любой уладзе ўсё беларускае на Беларусі вынішчалася. І, што самае страшнае, — нават сёння, калі мы жывём, нібыта, у самастойнай дзяржаве, працэс гэты не спынены, ён працягваецца і яскравае пацвярджэнне таму — нядаўні рэферэндум.

Апошнія пару гадоў мне даводзіцца часта сустракацца з моладдзю. Моладзь сёння дапытлівая. Заўсёды пытае: як там, за даўнім часам жылося? Вось я і распавяду пра тое жыццё-быццё, пра якое савецкія газеты і падручнікі напісалі шмат рознай лухты і няпраўды.

Нарадзіўся я ў 1920 годзе ў невялічкай вёсачцы Масцішча былога Дзісенскага павета. Бацькі мае былі сялянамі, праваслаўнага веравызнання. Насельніцтва ў нас скрозь было беларускім, і толькі ў павятовай Дзісне жылі габрэі ды там-сям уздоўж мяжы з Саветамі пракідваліся фальваркі польскіх асаднікаў.

Асаднікі з'явіліся дзесьці пасля 1921 года. Гэта былі легіянеры Пілсудскага, якім «начальнік паньства» даў зямельныя надзелы плошчаю 15-20 га на ўсходняй мяжы Польшчы. Асаднікі, па задуме польскіх уладаў, павінны былі выконваць функцыі інфарматараў на граніцы і, апрача таго, садзейнічаць паланізацыі беларускага насельніцтва. Не ведаю, як наконт інфарматарства, а вось што тычыцца паланізацыі, дык у гэтай справе яны поспеху не мелі. Дзеці асаднікаў бавілі час, вядома ж, з намі, сялянскімі дзецьмі, і таму спрэс гаманілі па-беларуску.

У школах, аднак, вучылі па-польску. У нашай чатырохкласнай SZKOLE POWSZECHNEJ, дзе я вучыўся, усе прадметы, апроч Закона божага, выкладаліся на «ензыку». «Ензыка» таго ніхто з нас не ведаў, таму вучоба, асабліва ў першым класе, ішла даволі цяжка.

Настаўнікі ўсе былі беларусамі: у душы многія з іх хіліліся да беларушчыны, але ўслых пра тое не казалі — баяліся згубіць працу. Улады пільна сачылі, каб у школе панаваў польскі дух, і калі хто з настаўнікаў пачынаў казаць «штосьці не тое», яго альбо звальнялі, альбо пераводзілі на працу ў глыбінныя раёны Рэчы Паспалітай. Дарэчы, «педкадрам» тады добра плацілі — прыкладна 150 злотых у месяц. І гэта пры там, што гарнітур з самага лепшага сукна каштаваў не болей 70 злотых. І наогул, настаўнікаў на вёсцы паважалі. Скажам, сяляне пры сустрэчы з «панам научыцелем» заўсёды злёгку кланяліся і прыўздымалі шапкі. Гэта ўжо потым, пры бальшавіках, аўтарытэт работнікаў школы звялі на нішто: плацілі (і плацяць) жабрачую зарплату і, да таго ж, прымушалі праводзіць у жыццё палітыку «роднай» камуністычнай партыі, ад якой добрасумленнаму працоўнаму чалавеку, не навучанаму красці, на вёсцы было моташна.

Заўважу таксама, што за польскім часам на вёсцы практычна не было п'янства, а сапраўдныя мацюгі, якія сёння зрэдзь часу зляцаюць нават з вуснаў дзяўчынак, мы ўпершыню пачулі ў верасні 1939 года, на расійскай мове.

Ну, а каб годна завяршыць тэму «паланізацыі», прыгадаю і польскі касцёл. Той таксама спрабаваў зрабіць з нас палякаў. Але без асаблівага поспеху. Памятаю, мы, дзятва, бегалі ў касцёл, калі хлопец з суседняй вёскі браў жонку-каталічку і ксёндз падчас шлюбу «пераварочваў» яго ў каталіцкую веру. Нам было цікава паглядзець: як гэта будзе адбывацца тое «пераварочванне».

Пасля шлюбу ксёндз дэманстратыўна даў жаніху ў якасці «ганарару» 5 злотых, але болей ахвотнікаў «пераварочвацца» ні ў нашай, ні ў суседніх вёсках не знайшлося.

Пасля сканчэння школы выправіўся я ў далёкі свет — у слаўнае месца Вільню, дзе жыў родны матчын брат — дзядзька Кузьма. Дзядзька быў адукаваным чалавекам і шчырым беларусам. Усю германскую вайну правёў на фронце, даслужыўся да штабс-капітана, а калі ў Расіі пачаліся рэвалюцыйныя заканоты, перабраўся ў Вільню, дзе стаў працаваць у беларускіх арганізацыях. Калі дзядзька прыязджаў да нас у адведкі, заўсёды прывозіў стос беларускіх газет і кніжак, якія я з вялікай цікавасцю чытаў. Вось ён і падгаварыў бацьку выправіць мяне ў Вільню — вучыцца ў беларускай гімназіі. Бацька спачатку вагаўся, чухаў патыліцу, а потым махнуў рукой: адвёз на станцыю, купіў квіт да Вільні і, навесіўшы яго мне на шыю, перахрысціў на развітанне.

Дагэтуль бываць у вялікіх гарадах не даводзілася, таму Вільня паўстала перад вачыма як штосьці казачнае і неверагоднае.

Гады, праведзеныя ў сценах Віленскай беларускай гімназіі, згадваюцца сёння, як чароўная пара. У гімназіі былі добрыя выкладчыкі: Мікола Анцукевіч, Вінцук Жук-Грышкевіч, Вольга Русак, Хведар Ільяшэвіч (беларускі літаратар), Барыс Кіт (выкладаў матэматыку: па вайне апынуўся з ЗША, дзе займаўся стварэннем аэракасмічнай тэхнікі), Алена Сакалова-Лекант (выкладчыца нямецкай мовы — вучні яе вельмі любілі. Сталася пакутніцай савецкага ГУЛАГа).

У першы год вучобы сядзеў над падручнікамі не разгінаючыся. Асабліва цяжка даваліся лаціна ды нямецкая мова, але потым справа пайшла лацвей, і неўзабаве я пачаў, як кажуць, азірацца на бакі ды браць удзел у розных вучнёўскіх імпрэзах.

У інтэрнаце пры гімназіі жылі хлопцы і дзяўчаты з усіх куткоў Заходняй Беларусі. Жылі дружна, дапамагаючы адно другому: за ўсе восем гадоў вучобы я ніколі не бачыў боек паміж вучнямі. У гімназіі мы не толькі вучыліся, але і з карысцю для сябе бавілі вольны час. Займаліся ў драматычным гуртку, вучыліся граць на духавых інструментах, а вывучыўшыся, хадзілі па віленскім бруку з аркестрам, а таксама спявалі ў хоры. Хорам кіраваў славуты Рыгор Шырма, дачка якога, Алена, вучылася са мной у адным класе. З натхненнем мы спявалі беларускія народныя песні, а таксама «Люблю наш край», «Адвеку мы спалі» ды іншыя песні беларускіх кампазітараў.

Пад Новы год заўсёды ладзіліся вясёлыя вечарыны, а 25 сакавіка, у гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, праводзіліся ўрачыстыя акадэміі, канцэрты хору і аркестра, а таксама выступы беларускіх паэтаў. Добра памятаю, як у нас чыталі свае вершы Максім Танк і Міхась Машара.

З цікавасцю чытаў менскія газеты. Іх выпісваў Беларускі музей імя Івана Луцкевіча, які месціўся поруч з гімназіяй і які мы, гімназісты, ледзь не кожнага дня наведвалі. Мушу сказаць, што ў той час я свята верыў ва ўсё, што пісалі савецкія газеты, і не даваў веры газетам польскім, якія паведамлялі страшныя рэчы пра сталінскія рэпрэсіі, пра жабрачае жыццё ў калгасах, пра палітычнае бяспраўе народа і шмат пра што іншае. Я верыў у тое, што ў Савецкай Беларусі людзі жывуць багата і шчасліва, што там няма прыніжаных і абяздоленых і што там квітнее наша родная беларуская мова і беларуская культура. Гэта ўжо потым, калі прыехаў аднойчы на вакацыі, людзі распавядалі, як бальшавікі на тым беразе Дзвіны высялялі людзей з памежнай зоны, прычым, тых, хто не жадаў высяляцца, груба выцягвалі з хатаў і жаночае галашэнне было добра чуваць на нашым беразе.

Гімназію скончыў у 1938 годзе і ад'ехаў з Вільні ў спадзеўцы зноў туды вярнуцца. Марыў вывучыцца на каморніка, а таму паехаў дахаты па даведку аб матэрыяльным стане бацькоў. Калі бацькі бедныя — можна было вывучыцца задарма, а калі не — за вучэнне трэба было плаціць грошы. І хаця наша сям'я — па тадышніх мерках — жыла бедна, мясцовыя ўлады мне такой даведкі не далі. Відаць, таму, што я быў шчырым беларусам і, адпаведна, не надта лаяльным да Польскай дзяржавы.

Застаўся ў вёсцы, стаў дапамагаць бацькам па гаспадарцы, у адначас займаючыся самаадукацыяй. Адразу па прыездзе падгаварыў бацьку набыць лямпавы радыёпрыймальнік і штовечара слухаў — што дзеецца ў свеце. А ў свеце дзеялася штосьці надта нядобрае — з Захаду насоўвалася вайна.

Улетку 1939 года польскія ўлады правялі частковую мабілізацыю, а потым пачалі «прыбіраць да рук» розных ненадзейных, з іх пункту гледжання, асобаў.

31 жніўня таго года ў нашу хату ўваліліся паліцыянты і абвясцілі, што я арыштаваны. У вёсцы, апроч мяне, заарыштавалі майго сябра Генуся Дзямешку (ён таксама быў шчырым беларусам), пана Шугальскага (той, па чутках, меў сувязь з камуністамі) і Рувіма Лехаха. За што ўзялі апошняга, я нават не ведаю.

Прыгналі нас, чатырох, у Дзісну, у паліцэйскі пастарунак, пасадзілі ў цёмны катух і там, сярод ночы, пачулі, як хтосьці дрыготкім голасам выгукнуў: — Wojna! Праз колькі дзён групу «падрыўных элементаў» перавезлі ў Глыбокае, здалі ў дэфензіву, але неўзабаве адпусцілі дахаты.

Ад ранку 17 верасня маці, як заўсёды, даіла кароў і раптам забегла ў хату і паведаміла, што ў Алешчыцах пажар. У Алешчыцах — невялічкім паселішчы на беразе Дзвіны знаходзілася польская памежная стражніца — вось яна і гарэла. Да таго ж там бухалі стрэлы, і я, між іншым, тады падумаў: можа, прыйшлі немцы?

Блізу абеду на гасцінцы, што лучыць Дзісну і Міёры, з'явіліся ўзброеныя людзі на маленькіх кудлатых конях (мы іх адразу назвалі «манголкамі»). Гэта ішла Чырвоная Армія, якая, як потым напісалі газеты, «працягнула руку братняй дапамогі народу Заходняй Беларусі, які стагнаў пад абцасам польскіх паноў і капіталістаў».

Польскія жаўнеры апраналіся надта фацэтна: усе скрозь у ботах, а тут ехала войска на «манголках», апранутае ў нейкія чорныя ватоўкі і абмоткі, і гэта нашых людзей надта здзівіла.

Шмат хто пабег сустракаць

(Заканчэнне на с.7.)

У сусвеце

Білінгвізм у ЗША: раз'яднанне грамадства?

Апошнім часам у амерыканскім друку ўсё часцей з'яўляюцца паведамленні аб тым, што дзяцей з англамоўных сем'яў супраць волі іхніх бацькоў пераводзяць у класы з іншай, неанглійскай мовай навучання толькі з тае прычыны, што ў іх «нетыя» прозвішчы ці паходжанне. У Беларусі гэткая з'ява — рэч звычайная. Але чаму падобнае адбываецца ў ЗША?

Усё пачалося ў канцы 60-х гадоў, калі ў краіне сталі ствараццца першыя неангламоўныя школы для дзяцей эмігрантаў, у першую чаргу іспанскамоўных. Сёння ў краіне існуе цэлая сістэма гэткіх школ, на ўтрыманне якой штогод выдаткоўваецца дзесяць мільярдаў долараў. На такім моцным фінансавым падмурку разраслася бюракратыя, зацікаўленая ў захаванні сістэмы іншамоўнага школьніцтва. Але што за лёс чакае дзяцей, якім у пачатковых класах мова іх краіны выкладаецца часам толькі паўгадзіны ў дзень? Сёння 30 працэнтаў дзяцей — выпускнікоў іспанскамоўных класаў — не ў стане атрымаць поўную сярэднюю адукацыю, бо яны недастаткова валодаюць англійскай мовай. У карэнных жа амерыканцаў гэты працэнт у тры-чатыры разы ніжэйшы.

Што дала краіне гэткая павага да чужой мовы? Да 60-х гадоў дзеці эмігрантаў навучаліся ў англамоўных школах і дзякуючы таму лёгка ўваходзілі ў новае моўнае асяроддзе. У эмігранцкіх анклавах ужываліся дзесяткі моваў, але гэта нікога не хвалявала — асобная роля англійскай мовы ніколі і нікім не аспрэчвалася. Праблемы шматмоўя папросту не існавала, тым больш, што мовай уладаў усіх узроўняў — ад мясцовай да федэральнай — была англійская.

Сёння ў ЗША на побытавым узроўні ўжываецца каля 300 моваў. Але карэнных амерыканцаў непакоіць не гэта, а іншае — спробы зрабіць асобныя з іх, у першую чаргу — іспанскую, роўнымі ў правах з англійскай. Але ж стрыжнем, вакол якога фармавалася амерыканская нацыя, была менавіта англійская мова. Таму заклік не дапусціць балканізацыі нацыянальнай культуры, што стала б пагрозай дзяржаўнаму і духоўнаму адзінству ЗША, стаў самым моцным аргументам тых, хто выступае за наданне англійскай мове статуса афіцыйнай.

На федэральным узроўні статус англійскай мовы як дзяржаўнай не вызначаны — у Канстытуцыі ЗША аб гэтым няма нават згадкі, хаця ў канцы XVIII стагоддзя, калі яна прымалася, насельніцтва краіны ўжо карысталася і іншымі мовамі. І нават праз сто гадоў — у канцы XIX — напачатку XX стагоддзя, калі пачалася масавая эміграцыя ў ЗША ірландцаў, італьянцаў, кітайцаў ды іншых народаў, пытанне аб дзяржаўнасці англійскай мовы не ўздымалася. Яна была дзяржаўнай не юрыдычна, а фактычна. Таму патрабавання валодаць ёй сёння няма нават у амерыканскім законе аб грамадзянстве — гэта значыць, што эмігранты ведаць яе не абавязаны.

Праўда, англійская мова прызнаная афіцыйнай законамі 22 амерыканскіх штатаў. Але на працягу апошніх гадоў прыхільнікі шматмоўя мноства разоў праз суд спрабавалі аспрэчваць гэтыя законы штатаў, спасылаючыся на тое, што яны супярэчаць Канстытуцыі ЗША. Ужо нават склалася практыка разгляду судамі рэгіёнаў, дзе англійская мова мае статус афіцыйнай, скаргаў эмігрантаў, якія, не валодаючы ёй, лічаць, што яны дыскрымінуюцца падчас уладкавання на працу, атрымання крэдыту ў банках і г. д. У пераважнай большасці выпадкаў суды выносяць рашэнні не на карысць ініцыятараў справы, спасылаючыся на тое, што мясцовыя законы не супярэчаць Канстытуцыі ЗША. Праўда, Вярхоўны суд краіны, які мае права праверкі адпаведнасці юрыдычных актаў Канстытуцыі, ніводзін з гэтых іскаў не разглядаў.

Затое ў штатах са значнай колькасцю амерыканцаў лацінаамерыканскага паходжання мясцовыя ўлады часта публікуюць свае акты на дзвюх мовах — англійскай і іспанскай. А ад кандыдатаў ва ўладныя структуры гэтых рэгіёнаў выбаршчыкі нават патрабуюць валодання гэтымі ж дзвюма мовамі, нягледзячы на незаконнасць такіх патрабаванняў.

Якія ж захады да абароны сваіх правоў робяць ангамоўныя амерыканцы? Сёння ў Кангрэсе ЗША абмяркоўваецца магчымасць прыняцця федэральнага закона аб статусе англійскай мовы як адзінай афіцыйнай і дзяржаўнай. У камітэтах палат Кангрэса разглядаецца некалькі законапраектаў. Аўтар аднаго з іх — сенатар Эмерсан — прапануе, надаўшы англійскай мове статус дзяржаўнай, дазволіць асобным дзяржаўным структурам — тым, што займаюцца сацыяльнай апекай, медыцынай і г. д., — карыстацца і іншымі мовамі. Затое праект сенатара Шэлбі прадугледжвае жорсткае абмежаванне магчымасці ўжывання іншых, акрамя англійскай, моваў. Чакаецца, што Закон аб мовах будзе прыняты ў ЗША ў бліжэйшы час. Бо і лідэр рэспубліканскай большасці ў сенаце ЗША, і спікер палаты прадстаўнікоў шмат разоў публічна заяўлялі аб тым, што яны з'яўляюцца прыхільнікамі закона аб першынстве англійскай мовы.

А як ставіцца да ідэі прыняцця гэткага закона амерыканскае грамадства? Сёння большасць амерыканцаў занепакоена тым, што наплыў эмігрантаў з краін Лацінскай Амерыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі, не валодаючых моваю сваёй новай радзімы, можа радыкальна змяніць характар нацыянальнай культуры краю. І гэты непакой адлюстравалі вынікі нядаўна праведзенага ў ЗША апытання грамадскай думкі, калі 73 працэнты рэспандэнтаў выказаліся за тое, каб адзінай афіцыйнай мовай іх краіны была англійская.

Што да каштоўнасці білінгвізму і двухмоўнай адукацыі, аб якіх гаварылася напачатку, дык даследаванні, праведзеныя два гады таму ў Каліфорніі — штаце з самай вялікай колькасцю іспанскамоўных амерыканцаў, паказалі: створаная для эмігрантаў сістэма двухмоўнага школьніцтва патрабуе вялікіх выдаткаў, дае малы плён і, што найважнейшае, раз'ядноўвае грамадства.

Падрыхтаваў У.ПАНАДА.

Кола сям'і

Масару ІБУКА

Пасля трох ужо позна

(Працяг.)

Фундаментальная здольнасць мозгу прымаць сігнал звонку, ствараць яго вобраз і запамінаць яго і ёсць тая аснова, той самы кампутар, на якім трымаецца ўсё далейшае інтэлектуальнае развіццё дзіцяці. Такія сталыя здольнасці, як мысленне, патрабаванне, творчасць, пачуцці, развіваюцца пасля трох год, але яны выкарыстоўваюць базу, сфармаваную да гэтага ўзросту.

Такім чынам, калі ў першыя тры гады не стваралася трывалая база, бескарысна вучыць, як яе выкарыстаць. Гэта ўсё роўна, што намагацца дасягнуць добрых вынікаў падчас працы на дрэнным кампутары.

Нясмеласць малога ў прысутнасці незнаёмых людзей — доказ развіцця здольнасці адрозніваць вобразы

Там, дзе дарослы чалавек схоплівае інфармацыю, галоўным чынам выкарыстоўваючы здольнасць лагічна мысліць, дзіця карыстаецца інтуіцыяй, сваёй унікальнай здольнасцю ствараць імгненны вобраз: спосаб мыслення дарослага не даступны дзіцяці і прыйдзе да яго пазней.

Самае яркае сведчанне гэтай ранняй пазнавальнай дзейнасці — здольнасць немаўляці адрозніваць аблічча людзей. Мне асабліва запомніўся адзін малы, якога я сустрэў у дзіцячай лячэбніцы. Гаварылі, што ён валодаў здольнасцю адрозніваць 50 чалавек ва ўзросце, калі яму было ўсяго крыху больш за год. Больш таго, ён не толькі пазнаваў іх, але і даваў кожнаму сваю мянушку.

«50 чалавек» — лічба, можа, не вельмі ўражвае, але нават даросламу цяжка запомніць 50 розных твараў на працягу аднаго года. Паспрабуйце запісаць падакладней рысы твару ўсіх вашых знаёмых і паглядзіце, ці можаце вы адрозніць адзін твар ад другога аналагічным шляхам.

Сучаснае выхаванне робіць памылку, калі мяняе месцамі перыяд «строгасці» і перыяд «усё можна»

Нават сёння многія псіхолагі і педагогі, асабліва тыя, што лічацца «прагрэсіўнымі», лічаць няправільным свядомае навучанне маленькага дзіцяці. Яны лічаць, што лішак інфармацыі адмоўна адбіваецца на нервовай сістэме дзіцяці і больш натуральна прадаставіць яго самому сабе і дазволіць рабіць усё, што ён хоча. Некаторыя нават упэўненыя, што ў гэтым узросце дзіця — эгаіст і робіць усё толькі для свайго задавальнення. Таму бацькі ва ўсім свеце пад уплывам такіх ідэй свядома захоўваюць прынцып «пакінуць у спакоі».

І тыя ж самыя бацькі, калі іх дзеці ідуць у дзіцячы садок ці школу, імгненна адмаўляюцца ад гэтага прынцыпу і раптам робяцца строгімі, спрабуюць выхаваць і чаму-небудзь навучыць сваіх дзяцей. Без дай прычыны «ласкавыя» маці пераўтвараюцца ў «пагрозных».

Між тым, з вышэй сказанага відавочна, што ўсё павінна быць наадварот. Менавіта ў першыя гады жыцця дзіцяці неабходна быць з ім і строгім, і ласкавым, а калі яно пачынае развівацца само, трэба паступова навучыцца паважаць яго волю, яго «Я». Дакладней кажучы, бацькоўскі ўплыў павінны перапыніцца да дзіцячага садка. Неўмяшальніцтва ў раннім узросце, а затым уціск на дзіця ў больш познім можа толькі загубіць у ім талент і выклікаць супраціўленне.

2. Што можа маленькае дзіця

Дарослыя паняцці «цяжка» і «лёгка» не падыходзяць для дзяцей

Мы, дарослыя, бяром на сябе смеласць сцвярджаць, напрыклад, што гэтая кніга занадта цяжкая для дзіцяці ці што дзіця не можа ацаніць вартасці класічнай музыкі. Але на якой падставе мы робім такія высновы?

Для дзіцяці, у якога няма дакладных, усталяваных уяўленняў пра тое, што «цяжка» ці «лёгка» — англійская ці японская мовы, музыка Баха ці дзіцячыя песенькі, аднагучная, аднастайная музыка ці гармонія гукаў, — усё павінна пачынацца адначасова, для яго ўсё аднолькава новае.

Вынік, зроблены на падставе пачуццяў, не залежыць ад ведаў, наадварот, веды могуць зрабіцца перашкодай для пачуццяў. Напэўна, многія, калі глядзелі на знакамітую карціну, казалі сабе: «Яна цудоўная!», хаця на самай справе яна вас зусім не кранула, яе каштоўнасць для вас — толькі ў імені мастака і ў яе цане. А дзіця, наадварот, заўсёды сумленнае. Які-небудзь прадмет ці занятак поўнасцю паглынаюць яго ўвагу, калі яму гэта цікава.

(Працяг будзе.)

Мудрыя гавораць...

Альбер Камю (1913—1960) — выбітны французскі пісьменнік, эстэтык, філосаф. Натуральнае зліццё літаратурнага таленту з філасофскай глыбінёй дазволіла Камю стварыць свой літаратурна-філасофскі стыль мастацкага даследавання і асэнсавання сучаснай эпохі, сучаснага чалавека, яго найвышэйшых каштоўнасцяў, сэнсу жыцця, гісторыі, культуры і цывілізацыі ўвогуле.

Кожны твор Камю меў апантаных прыхільнікаў і непрыхільнікаў, выклікаў спрэчкі. Пісьменніка называюць антыбуржуазным, але «левыя» таксама крытыкуюць яго... Камю быў сусветна вядомым, але на радзіме, у Францыі, яго імя амаль не ўпамінаецца. Камю заклікаў да стварэння універсальных каштоўнасцяў, універсальнага чалавечага грамадства, заснаванага на высокай маральнасці. Ён адвяргае званне філосафа і дэманстратыўна называе сябе маралістам. Варагавалі з пісьменнікам і прадстаўнікі рэлігіі, і прыхільнікі гістарычнага месіянства, і прыхільнікі капіталістычнага парадку, і рэвалюцыянеры ўсіх кшталтаў... Камю не далучаўся ні да адной плыні, суполкі ці партыі... Ён быў «сам — свой найвышэйшы суд». Таму нам цяжка «судзіць» яго. Прынята называць Альбера Камю філосафам-экзістэнцыяналістам. Але ён не прызнаваў гэтай філасофіі і не згаджаўся з яе асноўнымі пастулатамі...

Нарадзіўся будучы пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі, у Алжыры, у бядняцкай сям'і. «Я знаходзіўся паміж жабрацтвам і сонцам, — аналізаваў пасля Камю вытокі сваёй філасофскай думкі. — Жабрацтва перашкодзіла мне ўвераваць, быццам усё добра ў гісторыі і пад сонцам, сонца навучыла мяне, што гісторыя — гэта не ўсё». Камю давялося з цяжкасцю прабівацца ў жыцці. Аднак ён зрабіўся студэнтам Алжырскага універсітэта, вывучаў старажытнагрэцкую філасофію. У 1935 годзе арганізуе Тэатр працы, дзе спрабуе сябе і як драматург, і як акцёр, і як рэжысёр... Пісьменніка перапаўняе «прага дзейнасці», яму хочацца ўмяшацца ў сусветную палітыку, перамяніць усё на свеце на свой густ...

Падчас Другой сусветнай вайны Камю — у антыфашысцкім Супраціўленні. Ён рэдагуе газеты, пасля вайны ставяцца яго п'есы... Яму здаецца, што вось-вось адбудзецца рэвалюцыя, якая прывядзе да ўсталявання справядлівага грамадства... Аднак па прыродзе сваёй пісьменнік не быў цвярозым палітыкам: ён лічыў сябе прарокам, прапаведнікам, узнятым над натоўпам сляпых... Яго кнігі прынеслі яму міжнародную славу... Але ён заставаўся адзіным, самотным, «чужым» для ўсіх... Ён пратэстуе супраць усяго, мудра выкрывае ўсіх, крытыкуе ўсе філасофскія і палітычныя плыні і погляды...

4 студзеня 1960 года Камю разбіўся ў машыне, калі вяртаўся ў Парыж пасля святкавання Калядаў. У шуфлядах яго пісьмовага стала не знайшлося нічога, вартага друкавання...

Прапануем чытачам «Нашага слова» падборку выказванняў і афарызмаў Альбера Камю з яго нататнікаў.

Л.Ш.

У маладосці я патрабаваў ад людзей больш, чым яны маглі даць: вернасці ў сяброўстве, вернасці ў пачуццях...

Зараз я навучыўся патрабаваць ад іх менш, чым яны могуць даць: быць побач і маўчаць. І на іх пачуцці, на іх сяброўства, на іх высакародныя ўчынкі я заўжды гляджу, як на сапраўднае цуда — як на дар Божы.

Каштоўнасць падарожжу надае страх.

Калі жывеш навідавоку, няма небяспекі, што жыццё складзецца няўдала.

Імкненне заўсёды мець рацыю — прыкмета вульгарнага розуму.

Спазнаць сябе да канца — значыць памерці.

Людзі заўжды вераць не чалавеку, а ўяўленню, якое пра яго склалася.

Сямейныя пары: мужчына намагаецца перад кім-небудзь бліснуць. Жонка зараз жа: «А сам жа ты...» — і стараецца яго прынізіць, выставіць такой жа пасрэднасцю, як і яна сама.

Непавінны той, хто нічога не імкнецца давесці.

Палітыка краіны і лёсаў людзей знаходзяцца ў руках асобаў, пазбаўленых ідэалаў і высакароднасці. Тыя, у кім ёсць высакароднасць, палітыкай не займаюцца.

Таму, хто створаны для гульні, заўсёды добра ў кампаніі жанчын. Жанчыны — удзячная публіка.

Каханне не пазбаўляе нас ад эгаізму, але прымушае ўсвядоміць яго і нагадвае нам пра далёкую радзіму, дзе для гэтага эгаізму няма месца.

Каханне, якое не вытрымлівае сутыкнення з рэальнасцю, — гэта не каханне. Але ў такім выпадку няздольнасць кахаць — гэта прывілея высакародных сэрцаў.

Адны створаныя для таго, каб кахаць, другія — каб жыць.

Правіла. У кожным чалавеку бачыць перш за ўсё тое, што ў ім ёсць добрага.

Пра што чалавек думае, тым ён і робіцца.

Здароўе

Таццяна ФАМІНА,
кандыдат медыцынскіх навук

Яшчэ пра адну хваробу сістэмы стрававання

(Дыскінезія жоўцевых шляхоў і кішэчніка)

Разладжаная нервовая сістэма і дрэннае харчаванне спрыяюць узнікненню не толькі хваробаў страўніка. З гэтых прычынаў здараюцца функцыянальныя парушэнні жоўцевага пухіра, жоўцевыводных шляхоў і звязаная з гэтымі захворваннямі разладкай скарачэння гладкай мускулатуры кішак, што медыкі называюць дыскінезіяй жоўцевых шляхоў і кішэчніка. Цяперашнім часам на гэтую хваробу западаюць і маладыя людзі, нярэдкая яна і сярод школьнікаў.

Як яна выяўляецца? Хворыя скардзяцца на працяглы боль у правым баку пад рэбрамі («ные ў баку»), скардзяцца на цяжар у страўніку, а часам і на горкі прысмак у роце, нярэдка іх нудзіць. Адсутнасць апетыту тлумачыцца тым, што страўнік звычайна напоўнены, жывот нібы надзьмуты.

Хворыя, у якіх павышаная актыўнасць жоўцевага пухіра (гіпертанічная дыскінезія), скардзяцца на перыядычны спазмавы боль у правым баку пад рэбрамі пасля бегу, скокаў, а таксама пасля спажывання смажаных і тлустых страў. Боль можа аддавацца пад правую ключыцу, лапатку, а таксама ў паясніцу. Паміж прыступамі болю адчуваецца цяжар у правым баку пад рэбрамі.

Пры дыскінезіі жоўцевага пухіра і жоўцевыводных шляхоў надараецца адначасна сцісканне сфінктараў (колцавых мышцаў, якія, скарачаючыся, перапыняюць выцяканне жоўці) ды скарачэнне мускулатуры жоўцевага пухіра. Такія парушэнні перашкаджаюць рэгулярнаму апаражненню жоўцевага пухіра, што ўрэшце вядзе да затрымкі ў ім жоўці. (Праз гэта пазней пачынаюць разрастацца мышцы жоўцевага пухіра.) Такі застой жоўці называецца халестазам.

Дыскінезія кішэчніка — гэта разладжванне тонуса кішак і паступальнага руху рэчыва з страўніка далей па кішках, разладжванне страўнікава-кішэчных рэфлексаў ды іншых маторных функцыяў розных аддзелаў кішэчніка. Як гэта выяўляецца практычна? Хворы скардзіцца, што ён некалькі дзён не апраўляўся, або, наадварот, часты стул. Дакучаюць хвораму таксама болі ў жываце, бурчанне ў кішэчніку, пячайка. Дыскінезія кішэчніка суправаджаецца слабасцю, болем і адчуваннем «перабояў» (парушэнне рытму) у сэрцы, уражлівасцю на холад ды нематываванымі эмацыянальнымі выхадкамі.

ПРЫЧЫНЫ ДЫСКІНЕЗІІ

Як ужо згадвалася, узнікненне такога стану абумоўліваецца псіха-эмацыянальным і неўрагенным фактарамі, пастаянным стрэсам, што спалучаецца з сядзячым спосабам жыцця (або, як у дзяцей, з празмернай рухлівасцю) ды парушэннямі харчавання. Спрыяюць узнікненню дыскінезіі недахоп у ежы раслiннай клятчаткі, спажыванне свежага малака і малочных супоў, а таксама глісты, алергія, эндакрынныя ды нервовыя захворванні. Яна можа ўзнікнуць і пасля дызентэрыі, лямбліоза. Нерэгулярнасць харчавання, пераяданне, злоўжыванне лекамі, а таксама вынікі аперацыяў на страўнік і кішэчнік.

Пра магчымую прафілактыку дыскінезіі мы пагаворым наступным разам.

Аптэка танных лекаў

Грэчка

Паводле фізіялагічна абумоўленых нормаў харчавання кожны чалавек мусіць спажываць штогод сем з палавінай кілаграмаў грачанай крупы.

Дзеля лекавых мэтаў выкарыстоўваецца перш за ўсё так званая трава грэчкі. У зялёных сцяблінах гэтай расліны падчас квітнення ўтрымліваецца руцін (вітамін Р). Асабліва шмат яго ў пылку грэчкі. Як ужо згадвалася, руцін спрыяе трываласці капіляраў — папярэджвае кровазліццё. Ён узмацняе скарачэнне сардэчнай мышцы. У траве грэчкі ўтрымваюцца таксама хлорагенавая, галавая, протакатэхінавая і кававая кіслоты, антацыяны. Апошнія звязваюць іёны «цяжкіх металаў» і цыяністых злучэнняў (гэта атрутныя рэчывы). Лечаць руцінам дыятэз, кровазліццё ў сятчатку вока, а таксама «вынікі» прамянёвай тэрапіі ды гіпертанію.

Аналіз грачанай крупы паказвае, што ў ёй утрымліваецца ад 8 да 20 працэнтаў бялкоў, у тым ліку вельмі каштоўныя амінакіслоты — лізін і трыптафан, крухмал, каля 3 працэнтаў тлушчу, фосфар, жалеза, кальц, солі лімоннай, яблычнай ды іншых кіслот, а таксама вітаміны групы В: B_1, B_2.

Лічыцца, што грэчка асабліва карысная пры страўнікава-кішэчных захворваннях, малакроўі, парушэннях нервовай сістэмы ды пры ныркавых хваробах. Грачаную муку выкарыстоўваюць у выглядзе прыпарак і мазяў пры захворваннях скуры і пухлінах.

У народнай медыцыне грэчку выкарыстоўваюць як адвар яе кветак і лісця. Яго п'юць ад кашлю, а разам з травой аплавічніку (сушаніцы балотнай) — пры гіпертанічнай хваробе. Свежае грачанае лісце прыкладаюць да нарываў і гнойных ранаў. Парашком з сухога лісця прысыпаюць прэлую скуру ў немаўлятак. (Спажываць унутр свежае лісце і кветкі грэчкі небяспечна, таму што яны ўтрымоўваюць атрутныя рэчывы. З гэтай жа прычыны не даюць скаціне грачаную салому.)

Тлушч, што ўтрымоўваецца ў грачанай крупе, доўга не акісляецца, а таму грачаная крупа можа захоўвацца доўгі час, не трацячы сваёй харчовай вартасці.

З.С.

Мікалай КРЫЎКО — беларушчына.
Алена ШЧУКА — англійшчына.

СЛОЎНІК СІНОНІМАЎ

ПІКНУЦЬ размоўнае (зрабіць спробу сказаць што-н., запярэчыць чаму-н.) *А стараста маўчаў, баючыся слова пікнуць у нашу абарону* (Гарэцкі). *[Дзяжа:] — Цішэй. Стрымайце выбух гневу, Пасмейце пікнуць — улажу!* (Колас), **ПІСНУЦЬ** і **ПІСКНУЦЬ** разм. *[Яўхім:] — Каб на мяне, я б іх дауно прыцісну́ў! Я б іх так ліхадзеяў гэтых у кулак узяў, што і не піснулі б...* (Чарнышэвіч). *Пісар не толькі што размаўляць, піскнуць пры ім трэба каб баяўся, калі хочаце ведаць, шаноўны пане!* (Брыль).

ПІКО́ВЫ (які мае адносіны да картачнай масці пікі) *Цень ляжыць ад гордай елкі, Як піковы чорны туз* (Панчанка). *[Аня:] — Піковы туз, уніз пікай... непрыемнасць на скорым часе... якая ж гэта мне будзе непрыемнасць?..* («Беларусь»), **ВІНО́ВЫ** *Віновая дама. Азартна рэжуць туз на туз, Чыр-вовы туз на туз віновы* (Аўрамчык). — *А казыры ў нас віні. Во. віновая васьмёрка* (Васілёнак).

ПІЛАВА́ЦЬ (раздзяляць напалам пры дапамозе пілы) *Дзед хадзіў кудысьці на работу, ці то пілаваць, ці то складаць дровы* (Лынькоў). *Меншыя дзеці капашыліся на агародзе, большыя — пілавалі, калолі і складалі дровы* (Гурскі), **РЭ́ЗАЦЬ** *Асабліва любіў ён займацца хатняй гаспадаркай: рэзаў і калоў дровы, насіў ваду* (Якімовіч). *Дзям'ян усё бажыўся і круціў галавою, што, дальбог, не ведае, хто памагаў партызанам рэзаць слупы* (Адамчык).

Пілаванне, піло́ўка, рэ́занне, рэ́зка.
Пілаваць.

У англійскай мове знаходзім дакладна тую ж карціну: адзін дзеяслоў з спецыялізаваным значэннем — **saw** «пілаваць» і другі — **cut** з агульным сэнсам «рэзаць».

ПІЛАВІ́ННЕ зборнае (дробныя часцічкі матэрыялу, якія ўтвараюцца пры апрацоўцы яго пілой або напільнікам) *Цяпер піла зноў пайшла лягчэй, шпарка рассейваючы дробнае пілавінне* (Якімовіч). *Як вокам скінуць, ляжыць кругом спляжаны лес, бялеюць паўз камлі горбачкі свежага пілавіння* (Лецка), **АПІ́ЛКІ** адзіночн. апілак ліч. няма *Зазвінела піла, Застагнала сасна; Пры дарозе, Як слёзы, апілкі* (А. Александровіч). *Зноў скача зубамі Піла па камлі, Апілкі слязамі На снег пацяклі* (Жычка).

Пілавінне.

У англійскай мове таксама знаходзім тут два назоўнікі: **sawdust** і **filing**, але сінонімамі, уласна кажучы, яны не з'яўляюцца, паколькі выбар таго ці іншага залежыць ад матэрыялу і, адпаведна, ад інструменту пры яго апрацоўцы. Так, filing — гэта металічныя апілкі як вынік апрацоўкі металу напільнікам.

ПІЛАМАТЭРЫЯ́ЛЫ, *адз.* піламатэрыял, спецыяльнае (матэрыялы з дрэва, атрыманыя шляхам распілоўкі) *Вырастаюць карпусы дрэваапрацоўчага камбіната, які забяспечыць усё будаўніцтва піламатэрыяламі і вырабамі з дрэва* («Беларусь»). *Па дарозе ён [Іван Мацвеевіч] часта спыняе машыну. На лесапільцы распякае нядбайных мужыкоў за тое, што ўсюды парасківаны каштоўны піламатэрыял* (Хведаровіч), **ПІЛО́ЎКА** зб., разм. *Сеўшы на тоўстую сасновую пілоўку, дзед набраў прыгаршчы жоўтых апілак* (Рылько).

ПІЛАПАДО́БНЫ (вострымі выступамі, зубцамі падобны да пілы) *У пілы-рыбы даўжынёй у 6 метраў на верхняй сківіцы ёсць двухметровы пілападобны выраст, пры дапамозе якога рыба нападае на здабычу* («Заалогія»), **ПІЛАВА́ТЫ** *Пілаватае лісце.*

ПІЛІ́КАЦЬ разм., пагардлівае (іграць на смычковым інструменце) *[У карчме] у суботу, нядзелю і на свята пілікалі на скрыпках тутэйшыя не вельмі самавітыя музыкі Драбда і Шабас* (С. Александровіч). *Звычайна ў такіх тавернах (з дазволу гаспадара) прыжываецца пацешны старэчаскрыпач, які пілікае на такой жа старой, як і сам, скрыпцы* (Кобец-Філімонава), **ПІЛАВА́ЦЬ** разм., пагард. *Ды што тут хітрага? Пілуй сабе смычком, І будзе не канцэрт, а захапленне* (Корбан), **ПІШЧА́ЦЬ** і **ПІШЧЭ́ЦЬ** разм., пагард. *[Марыля:] — Пішчаць толькі на скрыпцы, ды і ўся з цябе тут рада і парада!* (Купала).

Уладзімір СВЯЖЫНСКІ,
кандыдат філалагічных навук

Гісторыя моваў на Беларусі

Беларуская мова

(Працяг.)

*«— Сонейка **села**!*
— Ну, гэта ўжо занадта!»
З чорнага гумару эпохі сталінізму.

У вузкім коле хаўруснікаў

(Сацыяльныя дыялекты)

Грамадства амаль заўсёды было падзелена калючым дротам і кратамі на дзве рознавялікія часткі. Па адзін бок гэтай мяжы знаходзілася большая частка — добрападзейныя грамадзяне, кожны з якіх «не был, не имеет, не привлекался», лічыць прыстойным чытаць толькі «Советскую Белоруссию» і галасаваць не за Пазьняка. Меншая частка, якая знаходзіцца па другі бок згаданага маральнага і матэрыяльнага бар'ера, была як бы абдзелена ўвагай грамадства, рэспектабельныя СМІ рабілі выгляд, што гэтых людзей як бы і не існуе. І толькі «на зара перестройки», калі набыла папулярнасць тэма ценявых бакоў жыцця грамадства, мы атрымалі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з насельнікамі «мест, не столь отдаленных». А разам з тым і з абслугоўваючым гэты кантынгент моўным утварэннем, абысці якое пры разглядзе формаў існавання мовы было б з навуковага пункту погляду некарэктным.

Натуральна, жаргон зняволеных узнік не ўчора. Ён пачаў фарміравацца з уваходжаннем грамадскага інстытута зняволення і яго матэрыяльнага субстрату — цямніц і самых зняволеных, у асяроддзі якіх і фарміраваліся асобыя нормы паводзін, у тым ліку і маўленчых, у выглядзе жаргону разглядаемага тыпу. Таму можна меркаваць, што асобныя элементы гэтага жаргону ўжо бытавалі ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Магчыма, у выніку спецыяльных даследаванняў гістарычных крыніцаў асобныя з іх будуць выяўлены. У сваім завершаным выглядзе жаргон зняволеных пачаў функцыянаваць ужо ва ўмовах развітай пенітэнцыярнай сістэмы. На Беларусі яна дасягнула вышэйшай ступені свайго развіцця пасля кастрычніцкага перавароту.

З пераходам да фарсіраванай індустрыялізацыі і гвалтоўнай калектывізацыі ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, усталяваўся і пачаў умацоўвацца дыктатарскі рэжым. Не толькі ў эканоміцы, але і ў палітыцы, ідэалогіі, навуцы, нават у маралі стаўка была зроблена на дыктат. На вялікіх будоўлях сталінскіх пяцігодак пачала выкарыстоўвацца праца спецперасяленцаў, бо пры дапамозе звычайных эканамічных метадаў было немагчыма перамясціць вялізную колькасць людзей для забеспячэння фарсіраванага выканання звышзаданняў. Для гэтага спатрэбіліся тэзісы і аб абвастрэнні класавай барацьбы, і аб масавым арганізаваным супраціўленні будаўніцтву сацыялізму. Галоўнае ўпраўленне лагераў (ГУЛАГ) забяспечвала значную долю грамадскай працы. Мэнавіта з гэтым былі звязаны разнарадкі па рэгіёнах на «ворагаў народа» і «шкоднікаў». Тая сістэма, якая будавалася пад лозунгамі сацыялізму, вымушана была звяртацца да рэпрэсій. Інакш яна не змагла б існаваць, бо не мела перспектывы ні ў эканамічных, ні ў палітычных адносінах. Каб атрымаць прычыну для ўзмацнення жорсткасці рэпрэсій, у 1934 годзе было здзейснена запланаванае забойства С.М.Кірава. З гэтага часу кожны чалавек не быў застрахаваны ад арышту і пакарання. Узрастала жорсткасць прыгавораў. У 1937 годзе яна дасягнула апагею. У Беларусі, як і ва ўсёй дзяржаве, распальвалася татальная падазронасць, варожасць сярод людзей, гальванізаваліся іх самыя ганебныя інстынкты і чорныя таямніцы душы. Даносы, паклёпы, агаворы зрабіліся звычайнай справай (паводле «Нарысаў гісторыі Беларусі», том 2. Менск; 1995. Стар. 201—206). Павелічэнне колькасці лагераў і турмаў, падаўжэнне тэрмінаў зняволення і колькасці саміх зняволеных — усё гэта і ствярала ўмовы для калектыўнай творчасці, у выніку якой і былі створаны жаргон савецкіх зняволеных.

Як вядома, асноўнай прыкметай жаргону разглядаемага тыпу з'яўляецца экспрэсіўнасць слоўвжывання, у выніку чаго і фармуецца сам жаргон. Экспрэсіўнасць маўлення — рэакцыя чалавечай псіхікі на знешнія фактары, у нашым выпадку — на ўмовы ўтрымання. Наўрад ці былі дастатковыя ўмовы для стварэння адпаведнага стану душы зняволенага, пры якім яго маўленне набывае экспрэсіўнасць, пры ўмовах утрымання, якія існавалі ў ва ўсходніх славянаў у старажытнасці. Так, у меню зняволенага, агаворанае «Рускай Праўдай» — зводам законаў XIII ст., уваходзіла: *«а коуровъ ему по двое на день, а хлебовъ на неделю, а пшена семь оуборковъ».* Няма іх і пры тых умовах, якія існуюць у сучаснай галандскай турме, пяць гадзін знаходжання ў якой журналіст «Огонька» назваў глытком свабоды. На вокнах гэтай турмы няма кратаў, няма абмежаванняў для перадач зняволеным, зняволены можа тэлефанаваць у любы горад свету, на яго рахунак можа быць пераказана любая сума грошай. У турме ёсць царква, студыя выяўленчага мастацтва, скульптурная майстэрня. Камера разлічана на аднаго чалавека (дзе тут умовы для перадачы і пераняцця жаргону?), у камеры ўсе зручнасці, падлога з лінолеуму, мяккі ложак, стол, крэсла, стул, настольная лампа, фіранкі на вокнах, тэлевізар, радыё з трыма праграмамі, хатнія тапачкі, крэм і шчоткі для абутку, плечыкі для адзення, вядро для смецця, шклянка, відэлец, нож, лыжка, (нашыя зняволеныя атрымліваюць толькі лыжку), кнігі, здымкі родных на паліцах, на паліцы ва ўмывальніку — брытва, мыла, адэкалоны(!). Зняволены мае права не выходзіць на працу. У абедзеннае меню у дзень знаходжання там журналіста ўваходзілі: венгерскі гуляш, мяса з ананасам(!), рыс, садавіна, у нядзелю — грыбны суп, карбанад(!) з гароднінай, яблычны мус; смажаная бульба, садавіна, кожны дзень — новыя стравы.

Мы ж маем тое, што маем. Вось як апісвае ГУЛАГаўскі рэжым знакаміты савецкі зняволены пісьменнік Аляксандр Салжаніцын у сваім вядомым апавяданні «Адзін дзень Івана Дзянісавіча»: «Одна радость в баланде бывает, что горяча... Баланда не менялась ото дня ко дню.. Из рыбки мелкой попадались все больше кости, мясо с костей сварилось, развалилось, только на голове и на хвосте держалось. На хрупкой сетке рыбкиного скелета не оставив ни чешуйки, ни мясинки, Шухов еще мял зубами, высасывая скелет — и выплевывал на стол... На второе была каша из магары. Она застыла в один слиток. Шухов ее отламывал кусочками. Магара не то что холодная — она и горячая ни вкуса, ни сытости не оставляет: трава і трава, только желтая, под видом пшена».

Культура мовы

Што такое *запазычанне*?

Палеміка вакол слоў **пазычанне** і **запазычанне** не сціхае, здаецца, яна зайшла ў тупік, бо ўжо цягам ладнага часу паўтараюцца тыя самыя довады з абодвух бакоў. А сказаць новага, відаць, можна толькі памяняўшы бачанне. Адразу ж мушу зазначыць, што тэрмін **пазычанне** мне падаецца дзеля свае кароткасці значна ўдалейшым і спраўнейшым за адварotны. Для навукі эканомія — рэч досыць паважная, хаця не канечная, але нельга казаць, быццам іншы бок зупоўна не мае рацыі.

Так, дзеяслоў **запазычыць** не можа лічыцца за кальку з расійскае мовы ўжо хаця б таму, што гэтакі ёсць і ў мове польскай (быў і ў старабеларускай), але ён у пэўных умовах мог актывізавацца, разам семантыка прыстаўкі **за-** тут не да канца зразумелая. На маё цвёрдае перакананне, феномен мовы праяўляецца толькі ў дыялектах і працягламі традыцыі. Усякае ж літаратурнае тарнаванне адносіцца да маўлення. Гэта вельмі добра адчуваў Я.Станкевіч, таму яго слоўнік як праца выдатнага фенаменолага мовы мусіць дапамагчы ўразвязанні пастаўленай задачы. Таму у двух гнёздах на словы **зычыць** і **пазычыць** спатыкаецца гэтулькі прыстаўкавых утварэнняў, што дзіўна было б адмысловa змагацца з бедным прэфіксам **за-**.

Вось некаторыя з іх: **прылазычыць** «призанять», **зычыць** «ссужать», **зычыцца** «раззориться от одолжений», **належычаць** «наодолжать», **выпазычыць** «пораздавать в долг», **вызычаць** «помогать одолжением», **запазычацца** «задолжать», **запазычыць** «перенять», **адзычыць** «отсоветовать; отблагодарить», **узычыць** «предоставить, удружить», сюды ж можна было б дадаць **распазычыць** «раздать в долги» і г.д. Як бачым, прыстаўка **за-** можа даваць наступныя значэнні: 1) пазычыць назаўсёды, а не на час, 2) убіцца ў пазыкі, напазычыць вельмі шмат.

Пакуль мы карыстаемся дзеясловамі, то праблемаў з разрозненнем першага і другога значэнняў не ўзнікае дзякуючы постфіксу **-ся**. Але ўжо назоўнік **запазычанне** ды прыметнік **запазычаны** вымагаюць для дакладнага разумення пэўнага кантэксту. А ўзятыя асобна яны ўсё ж больш імкнуцца да другога значэння, ад дзеяслова **запазычыцца**. Ці не разумней было б на гэтым і спыніцца. Балазе, яшчэ «Сіноніма славенароская» **заемление** трактавала як **пазычанне**, а не **запазычанне**. Традыцыя гэная перахавалася аж да нашаніўскае пары і спатыкаем яе мы ў Сяргея Палуяна. *«Нам трэба шмат новых слоў, а пазычаць (падкрэслена мною, — Ю.П.) у суседзяў ня надта хочацца; вось і прыходзіцца карыстаць старымі беларускімі словамі».* Урэшце, **запазычыць** у значэнні «пераняць» паводле сама падставовых дыялектных слоўнікаў зафіксавана толькі аднойчы, Бялькевічам. Значыць, яно мала ўласцівае жывой гутарковай мове і з'яўляецца словаўтваральным плеаназмам.

У схілку хацелася б дадаць, што плеаназмы распаўсюджваюцца не без уплыву расійскае мовы. Яны робяць беларускую мову груваcткаю, маластраўнаю, але ўсё роўна трываюць, бо надта зручныя для аўтаматычнага перакладу. Прыкладам, у Байкова і Некрашэвіча было слова **вінавальнік**, цяпер замест яго ўпарта прапаноўваецца польска-расійскі гібрыд **абвінавяўца**. Плеаназмам мне ўяўляецца і слова **абвінавачанне**, бо дзеянне можна абазначыць і без прыстаўкі — **вінавачанне**, а бок на судзе вымагае зборнага назоўніка **вінавацтва**; параўнайма: *«...І як для вінавацтва, так для абароны, каб былі ў час на месцы сведкі і староны»* (Стары Улас). Усё часцей спатыкаецца абсурднае слова **накірунак**, кантымінацыя беларускага **кірунак** і расійскага **направление**. Вымогамі аўтаперакладу з'явіліся на свет такія калькі, як **своечасовы** замест **учасны**; **неабходнасць** замест **канечнасць, патрэба, мус** і г. д. Пакуль у Беларусі пануе двухмоўе з перавагаю расійшчыны — датуль будуць расці і множыцца словы-калекі. Не дзіўна, што менавіта прыхільнікі двухмоўя абараняюць гібрыдную лексіку.

Юрась ПАЦЮПА.

Матэрыялы да слоўніка «Беларускія імёны»

Сымон БАРЫС

Як у нас клічуць?

Жаночыя імёны

(Працяг.)

Ма́я. Мая (бел.) Утворана ад месяца май. Майя — рымская багіня жывой прыроды. Вытв. Майка, Маечка, Маюля.

Ма́ра. Мара (бел.). Вытв. Марачка, Маруля.

Меліціна. Мелитина.

Мі́ліца. Мі́ла. Милица (слав.) — мілачка, мілавідная. Вытв. Мілачка, Мілка, Мілаша, Мілава.

Мі́ра. Мірасла́ва. Мирослава (слав.) — славіцца мірам. Вытв. Мірка, Мірачка. Імяніны катал. 11.05; 26.07.

Міхалі́на. Михалина. Утворана ад мужчынскага імені Міхал (яўр.) — той, хто як Бог. Вытв. Міхалінка, Міхася, Міхаліначка. Імяніны катал. 29.09.

Мо́ніка. Моника — напэўна, згрэц. монос, што азначае адзінокі, самотны. Імяніны катал. 4.05; 27.08.

Му́за. Муза (грэц.) — багіня навук, мастацтва. Вытв. Музачка, Музанька. Імяніны пр. 29.05.

Міланега. Милонега (слав.). Вытв. Міланейка, Мілка, Міланежачка.

Мла́да. Млада (слав.). Вытв. Младка, Младачка, Младуля.

Мечысла́ва. Мечислава (слав.). Утворана ад мужчынскага імені Мечыслаў (слав.) — «Мятаць» славу. Вытв. Мечка, Слава.

Мсціслáва. Мстислава (слав.). Утворана ад мужчынскага імені Мсціслаў (слав.) — мсціць слава. Вытв. Слава, Славачка, Славуля.

Надзе́я (бел.). Надежда (расійск.) — калька з грэц. імені Ельпіс — надзея. Вытв. Надзя, Надзейка, Надзеечка, Надзюня, Надзюнька, Надзюся, Надзюсенька, Надзюська, Надзюсечка, Надзька, Надзюшка, Надзюша. Імяніны пр. 30.09.

На́ста, Наста́ся. Анастасия (грэц.) — уваскрасенне, перасяленне. Вытв. Нустуля, Настулька, Настулечка, Настуся; Насця, Насцюха, Насценька, Насцечка; Стася, Тася. Імяніны: пр. 4.01; 28.04; 12.11; катал. 27.02; 15.04.

Згадкі

Жыццёвыя прыгоды простага беларуса

(Заканчэнне. Пачатак на с.4.)

вызваліцеляў, жанкі прынеслі слоікі малака, але чырвонаармейцы паводзілі сябе, на дзіва, сурова: у размовы не ўступалі і ад малака адмаўляліся, баючыся, відаць, што яно атручанае.

А наогул прыход Саветаў бальшыня народа сустрэла, кажучы «застойнаю» моваю, з пачуццём глыбокага задавальнення. Асабліва ўзрадаваліся беззямельныя сяляне, спадзеючыся, што іх надзеляць зямлёю.

Праз колькі дзён па вёсках арганізавалі сялянскія камітэты, з-за Дзвіны прывезлі савецкія газеты, партрэты Сталіна і наркома Варашылава, чырвоныя сцягі і транспаранты, і мы цэлы месяц хадзілі з тымі сцягамі і транспарантамі з вёскі ў вёску, дзе ладзіліся мітынгі. Поруч з правядзеннем мітынгаў праводзіліся таксама масавыя арышты. Спачатку пахапалі польскіх жаўнераў-памежнікаў і паліцыянтаў, потым розных урадоўцаў, потым асаднікаў, нарэшце, узімку сабралі да кучы ўсіх леснікоў і выправілі ў Баразвецкі лагер.

Зрэшты, простых сялян новая ўлада да пары не чапала. Больш таго, неўзабаве прывезлі школьныя падручнікі і ў суседняй вёсцы Дрыгучы адчынілі беларускую (ці, лепей сказаць, савецкую) школу. Вось у тую школу я і ўладкаваўся на працу.

Але адчынялі не толькі школы, але і аддзелы міліцыі, ваенкаматы ды іншыя савецкія ўстановы. Панаехала таксама шмат розных інструктараў і ўпаўнаважаных, якія праводзілі ў жыццё палітыку савецкага кіраўніцтва, а што гэта за палітыка — сяляне ў хуткім часе зведалі напоўніцу.

Па-першае, на кожны двор накінулі падатак, выплаціць які многім сялянам было папросту не пад сілу, па-другое, — кожнаму двару давялі план абавязковых сельгаспаставак: дзяржаве трэба было здаваць збожжа, яйкі, мяса, воўну, а таксама ўвялі так званы культзбор. Вось тут сяляне і папраўдзе застагналі, але ўжо не пад абцасам польскіх паноў, а пад абцасам савецкіх інструктараў і ўпаўнаважаных. Спачатку ад тых упаўнаважаных не ведалі, куды хавацца, але неўзабаве нашы людзі вынайшлі эфектыўны сродак. А менавіта: пачалі частаваць таварышаў самагонам. Напачатку тыя нібыта адмаўляліся, а потым пачалі браць на поўную губу. А кульнуўшы ладную чарку, зніжалі падаткі.

Дзесьці праз год пасля «вызвалення» па вёсках пайшлі гуляць чуткі пра арганізацыю калгасаў і шмат хто не на жарты ўсхваляваўся, ведаючы, што самагонкаю ад калгаса не адкупішся. Але тут насунулася другое страшнае няшчасце — гітлераўская нашэсце.

Раніцай 22 чэрвеня 1941 года я, па старой завядзёнцы, уключыў радыёпрыймальнік і на хвалі радыёстанцыі «Кёнігсберг» пачуў брахлівы голас нямецкага дыктара. Нямецкую мову я збольшага ведаў і, прыслухаўшыся, пачуў такое, што прымусіла не на жарты ўсхвалявацца. Дыктар зачытваў паведамленне, з якога вынікала, што «войскі вермахта, зрываючы агрэсіўныя планы бальшавікоў», распачалі вайну супраць Савецкага Саюза. Ліхаманкавым рухам настроіў на «Гляйвіц» — нямецкую радыёстанцыю, якая вяла перадачы па-польску, і пачуў тое ж самае: радыё перадавала мемарандум Гітлера з нагоды пачатку вайны з бальшавікамі. Пасля таго я, вядома ж, паслухаў Менск, потым Маскву, але яны перадавалі вясёлую музыку, і ў мяне адлягло ад сэрца. Пабег на Дзвіну — даў нырца ў прахалодную ваду і падбегам вярнуўся дахаты. Зноўку паслухаў радыё і зноўку пачуў тое ж самае — пагрозлівы мемарандум Гітлера на нямецкіх хвалях і вясёлую музыку на хвалях савецкіх. Казаць пра пачутае не наважыўся нават суседзям, паведаміў толькі дзядзьку Кузьму, які тады ўжо з'ехаў з Вільні і жыў на другім канцы вёскі.

Праз пару дзён пачалася мабілізацыя ў Чырвоную Армію. Бралі чамусьці мужчын 1917—1918 гадоў нараджэння, а ўжо ў пачатку ліпеня бальшаком праз нашу вёску ішлі «войскі доблеснага вермахта». І зноўку нашыя людзі стаялі на ўзбочыне, прыглядаючыся да чарговых «гасцей».

Сяляне, памятаю, адразу ацанілі нямецкіх коней. Коні і сапраўды былі ладныя: адкормленыя, высакарослыя. Наогул немцы рухаліся даволі акуратна. Ніякіх расстрэлаў і гвалту над насельніцтвам, як гэта паказваюць у «кінах», не чынілася. Праўда, паводзілі сябе новыя «госці» надта бесцырымонна. Прыйдуць, да прыкладу, у чыйнебудзь двор і абавязкова пазбіваюць прыкладамі ўсе замкі і запоры. Апроч таго, рэквізавалі ў сялян фураж і коней. У нас таксама каня забралі. Скажу яшчэ, што і падаткі, якімі немцы абкладалі насельніцтва, не ішлі ні ў якае параўнанне з аналагічнымі савецкімі. За ўсю вайну наша сям'я ў якасці падатку аддала толькі цялушку ды тое-сёе з фуражу. Школы пры немцах таксама працавалі, прычым усе яны былі беларускія. І вучылі ў іх, у асноўным, па савецкіх падручніках, адно што партрэты праваднікоў з іх павыдзіралі. Потым многіх настаўнікаў пастралялі партызаны, а хто выжыў ды не з'ехаў з немцамі, тыя ў бальшыні сваёй знайшлі спачын на Калыме. На думку крамлёўскіх верхаводаў, дзеці на акупаванай тэрыторыі не павінны былі вучыцца ў школе, а павінны былі ўсе як адзін падацца ў «народныя мсціўцы».

Дарэчы, першыя партызаны ў нас з'явіліся ў другой палове сорак другога года. Гэта былі акружэнцы з Расонскіх лясоў, якія перабіраліся праз Дзвіну і блукалі начамі па навакольных вёсках у пошуках харчу. Ну, а сапраўдны партызанскі рух разгарнуўся з пачатку наступнага, сорак трэцяга года. Арганізатарамі руху сталіся спецгрупы, якія прыходзілі з-за лініі фронту з мэтаю ўчынення дыверсій у нямецкім тыле. На кожную дыверсію немцы адказвалі актамі тэрору супраць мірнага насельніцтва. У выніку такіх дзеянняў нешматлікія дагэтуль групы «народных мсціўцаў» сталі папаўняцца людзьмі і ўвесну 1943 года на Дзісеншчыне — Міёршчыне ўжо на ўсю моц шугала полымя партызанскай вайны.

Там-сям у адраджэнскай літаратуры даводзіцца чытаць, што, маўляў, нямецкія ўлады з разуменнем ставіліся да беларускага патрыятычнага руху і нават у нечым яму спрыялі. Не ведаю, як дзе, а ў нашых мясцінах нічога такога не назіралася. Больш таго, нямецкія прыхвасні з ліку польскіх афіцэраў, якія ўзначальвалі цывільную ўладу, зніршчалі беларускіх патрыётаў не горай ад бальшавікоў. У Дзісне цывільным камендантам быў паляк Свінарскі, а ў намесніках каменданта хадзіў ягоны суайчыннік Альхімовіч, якія люта ненавідзелі беларусаў. 27 траўня 1942 года гэты самы Альхімовіч застрэліў з пісталета дзядзьку Кузьму і скінуў з пясчанага адхону. А дзесьці праз год пан Свінарскі зацікавіўся і маёй асобай. Адзін мой знаёмы, што жыў у Дзісне, паведаміў пра гэта і параіў кудынебудзь прыхавацца.

Сабрала мне маці хатуль у дарогу, паплакала на развітанне і да весніц праводзіла. І пайшоў я ў мястэчка Лужкі, да свайго сябра Валодзі Стомы, з якім разам вучыўся ў Віленскай гімназіі.

Да Лужкоў, аднак, не дайшоў: як кажуць, бег ад ваўка ды на мядзведзя наскочыў. Каля вёскі Гарадзец на дарогу выйшлі людзі ў нямецкай вайсковай форме і па-расійску загадалі: «Стой! Руки за голову!». Абмацалі з ног да галавы, спыталі, куды іду, а потым тыцнулі ў спіну руляй карабіна...

Тыдзень сядзеў пад вартаю разам з тузінам гэткіх жа вясковых хлопцаў. Ад іх і даведаўся — да каго патрапіў. Як высветлілася, у Гарадцы кватараваў полк так званай «Рускай нацыянальнай арміі», якім камандаваў падпалкоўнік Радыёнаў. Пасля допыту мяне і колькіх іншых вязняў адправілі чысціць бульбу, а неўзабаве пастроілі перад камендатурай і абвясцілі, што мы мабілізуемся ў «Нацыянальную армію».

Ваяваць на баку немцаў, вядома, ніхто не хацеў. Некалькі «мабілізаваных» паспрабавалі было збегчы, але іх злавілі і, па чутках, расстралялі. Пасля таго мы, казаў той, прыціснулі вушы і сталі чакаць — што будзе далей. Але далей нічога такога не надаралася. Праз месяц, а пэўнай ночы нас пастроілі ў калону і загадалі рушыць наперад. Пайшлі мы ў накірунку Докшыцаў, перайшлі чыгунку і ў адным з лясоў пачулі наступнае: полк распачынае барацьбу з нямецка-фашыстоўскімі захопнікамі і будзе называцца 1-й Антыфашыстоўскай партызанскай брыгадай. Так начальства дамовілася.

Жыццё партызанскае не было салодкім. Двойчы быў паранены. Другім разам — цяжка. Збіраўся ужо вярнуць Богу душу, але, на шчасце, апынуўся паблізу партызанскага аэрадрома — ля вёскі Гуты — Сяржаны Вушацкага раёна, — і мяне самалётам перакінулі на савецкую тэрыторыю.

А пасля папраўкі апынуўся ў вучэбным танкавым палку, а ў складзе 37-й мехбрыгады ізноў на вайну.

Дахаты вярнуўся прыканцы лістапада 1945 года. Усё навокал ляжала ў руінах, усё было спляжана і панішчана. Уладкаваўся на працу ў школу, і ўсё астатняе жыццё — аж да пенсіі— працаваў настаўнікам.

Зрэшты, дзеля чаго я пра ўсё гэта распавёў? Толькі з адною мэтаю: паказаць, што беларус на сваёй зямлі ва ўсе часы быў прыніжаным і бесправным. Любая ўлада, якая існавала на Беларусі, знішчала свядомых беларусаў, знішчала нашу мову і культуру, і таму не дзіва, што напярэдадні другога тысячагоддзя ад нараджэння Хрыстова мы, беларусы, ператварыліся ў натоўп, які не ведае, што рабіць, куды бегчы і, разявіўшы рот, слухае байкі розных прайдзісветаў.

«Новая газета» (Наваполацк).

Уражанні

Старшынёва «рош»

Малады, гадоў трыццаць пяць, а можа крыху болей, старшыня калгаса, з якім мы агледалі палетак, паводзячы рукой, загаварыў:

— Вот там у нас посеяна рош, а за пасадками — грачыха, двадцать гектаров...

Ці даўно ён, ураджэнец вялікай слуцкай вёскі, дзе матчына мова яшчэ пакуль не забыта-закінута, як у горадзе, гаварыў «жыта», «грэчка», «бульба», «гарбуз»? Пакуль не пайшоў у «людзі». Армія, сельскагаспадарчы інстытут, наменклатурнае асяроддзе раённага маштабу, дзе мова беларуская не ў пашане, — ёю і сёння пагарджаюць, зрабілі сваю справу. І на сустрэчы з вучнямі вясковай школы з нагоды пачатку навучальнага года, куды запрасілі і старшыню, ён, нягледзячы на тое, што дзеткі-першакласнікі ды настаўнікі гаварылі па-беларуску, папрасіўшы прабачэння, сказаў:

— Я буду говорить по-русску.

А выйшла звыклая «трасянка». Каб адзін ён такі быў сярод старшыняў, калгасных спецыялістаў, канторскіх чыноўнікаў!

Штрафнік

З ім я пазнаёміўся ў доме адпачынку «Мікалаеўшчына» на Стаўбцоўшчыне. Маладжавы, спартыўнага «профілю» мужчына, калі мы ўспомнілі мінулую вайну, прызнаўся, што пабываў у штрафбаце. Трапіў туды за тое, што пры канваіраванні на Курскай дузе палоннага нямецкага афіцэра-танкіста прыстрэліў яго, не давёўшы да штаба корпуса.

— За што ж Вы яго так? — спытаў я. — Палонны мог даць у штабе каштоўныя звесткі.

— А ён, сука, па дарозе стаў лаяцца, ды яшчэ па-руску. Ну, я яго з аўтамата і шарахнуў. Ваенны трыбунал за невыкананне задання ўпёк мяне на год у штрафны батальён. У першым жа баі мяне параніла — вось крывёю і выкупіў віну.

А ў 45-м у Германіі, ужо ў маі месяцы, на ягоных вачах наш сяржант выкінуў праз акно з чацвёртага паверха безнагога немца-інваліда толькі за тое, што на сцяне ў яго кватэры вісеў вышываны ўкраінскі ручнік. Магчыма, салдат вермахта прыхапіў яго пры адступленні ва ўкраінскай вёсцы ў якасці сувеніра. І хоць ля таго інваліда стаялі ў трывозе жонка і двое дзетак, памслівы, у лютай нянавісці да ўсяго нямецкага, сяржант-украінец не спыніўся перад злачынствам.

— Чаму ж Вы не адгаварылі яго ад непатрэбнай пасля заканчэння вайны лішняй ахвяры? — пытаюся ў былога штрафніка.

— Ды Вы што! Я дапамагаў сяржанту — акно адкрываў. Мы там і не такое вытваралі!

Самога ж пасля вайны ў Заходняй Беларусі аднойчы ледзь не прыстрэлілі «бульбашы», што хаваліся па лясах і нярэдка рабілі на дарогах засады. Майго знаёмага паслалі з сябрам выбіваць чарговую пазыку ў вёсцы. Іх затрымалі «лясныя браты» — і ўжо знялі з плеч аўтаматы. Палічылі за энкавэдыстаў. І тут сябра штрафніка паказаў на руцэ вытатуіраваны нумар вязня Асвенцыма. Гэта і выратавала абодвух — іх адпусцілі.

Вернасць «рíднай» мове

Бабуля Фядора прыехала ў вёску на Случчыну да сына, прадаўшы на Чаркасчыне сваю хату. На старасці гадоў цяжка стала адной весці гаспадарку. У жанатага сына яна таксама ёсць, ды яшчэ ўнукі. Чатыры гады Фядора на новым месцы, а «рíдна» мовы не забыла — так і сыпле па-свойму.

— Ну, а вяскоўцы вас разумеюць? — пытаюся ў Фядоры.

— Дык хто ж іх ведае, я не пыталася. Тільки іх мову я не можу разумеці. Ні руска, ні беларуска, як па радзіво мовяць. Тільки сусідка, інтэлігентна жінка, у канторы працуе колгоспной, чысто по-беларуску мовіць. Я ее поважаю за гето.

Не паддаецца асіміляцыі бабуля Фядора — як і цыганы, што за стагоддзі вандравання па свету мове сваёй не здрадзілі. Як сыдуцца у гурт — так і не зразумееш іх гамонкі.

«Заслужаны» двор

Старая, асеўшая ў зямлю ніжнім вянцом хаціна з двума вокнамі на вуліцу, і двума — у зарослы быльнягом і крапівою двор. На дзвярах у сенцы замка няма, толькі клямка накінута на прабой, «змацаваны» палачкай. На вуглу хаціны — дошчачка з выявай сярпа і молата і словамі: «Здесь живет заслуженный колхозник». Цікаўлюся ў першай сустрэчнай вясковай жанчыны, хто ў хаціне жыў.

— Бабуля, памерла два гады назад. А муж — яшчэ раней. Сын іх адзіны недзе ў горадзе жыве, то не чутна, каб прыязджаў сюды, хоць у вёсцы ўжо нямала гараджан пакуплялі хаты.

Даведаўся яшчэ, што пры жыцці «заслужаная» працавала і даяркай, і свінаркай, і на палявых — «куды пашлюць». Калгасная адміністрацыя ў тыя застойныя гады такім шчырым, непатрабавальным да ўмоў працы і памеру аплаты савецкім батракам прысвойвала званне «заслужаны калгаснік», якое давала нейкія не надта раскошныя льготы. Толькі яны, тыя льготы, ніколькі не ўзнімалі прэстыжнасць паднявольнай працы ў вачах дзяцей і ўнукаў тых «заслужаных». У большасці пасля заканчэння вясковай школы яны «галасавалі» нагамі за гарадскі лад жыцця — хоць прыбіральшчыцай ці асенізатарам.

Горкі лёс напаткаў хаціну і двор, што зарос быльнягом.

Міхась ТЫЧЫНА.



Выразаць з дрэва, інкруставаць, вышываць, плясці з саломкі, рабіць на прутках і кручком вучаць дзяцей у Бярозаўскай школе народнай творчасці. За дзяцей з незаможных сем'яў плаціць райвыканкам.

На здымку: Заняткі ў школе народнай творчасці вядзе **Таццяна Мікалаеўна Мартысевіч-Якушык.**

Фота Яўгена КАЗЮЛІ, БелТА.

Маладзечна, Вілейка, Смаргонь, Ашмяны, Валожын, Мядзел, Астравец, Мінск

Рэгіянальная газета

«Маладзечна, Вілейка, Смаргонь...»

Назвы гэтых, а таксама іншых гарадоў маладзечанскага рэгіёна вынесены над загалоўкам «Рэгіянальнай газеты» — штотыднёвага выдання фармату раёнкі, якое больш за паўгода выдаецца ў Маладзечне і распаўсюджваецца па падпісцы і ў розніцу ў Маладзечне, Вілейцы, Смаргоні, Ашмянах, Валожыне, Мядзелі, Астраўцы і сталіцы Беларусі. Кожную пятніцу «РГ» публікуе самыя свежыя і цікавыя навіны рэгіёна, бясплатныя прыватныя аб'явы, праграму тэлебачання, рэкламу. Тут можна знайсці сенсацыйныя матэрыялы, гутаркі з вядомымі землякамі, даведкі аб руху транспарту...

Цяпер на «Рэгіянальную газету» можна падпісацца ў любым кутку Беларусі. Мы разлічваем знайсці свайго чытача сярод нашых землякоў, якіх лёс адарваў ад малой радзімы. Толькі «РГ» дасць вам аператыўную і поўную інфармацыю аб тым, што дзеецца ў вашым бацькоўскім доме. Зацікавіць «РГ» і дзелавых людзей — рэклама і аб'явы на старонках нашай газеты — лепшая крыніца інфармацыі з аднаго з самых буйных і важных прамыслова-гаспадарчых рэгіёнаў Беларусі. Падпісная цана на паўгоддзе — 24000 рублёў, індэкс «Рэгіянальнай газеты» — 63212. Чакаем сустрэчы з новымі сябрамі!

Аляксандр МАНЦЭВІЧ,
галоўны рэдактар
«Рэгіянальнай газеты»,
Маладзечна.

У старых фаліянтах

•

У маладосці, падчас плавання на Эгіну, Дыягена захапілі ў палон разбойнікі. На рынку, дзе яго прадавалі ў рабства, адзін з пакупнікоў пацікавіўся:

— Гэй, якім рамяством валодаеш?

— Кіраваць людзьмі, — высакародна, з пачуццём уласнай годнасці адказаў філосаф.

Адзін чалавек з Эгіі, на імя Анесікрыт, паслаў па справах у Афіны Андрасфена — аднаго са сваіх сыноў. Той, паслухаўшы Дыягена, там і застаўся. На пошукі брата скіраваўся Філіск, але таксама не меў моцы вярнуцца. Разгневаны бацька з цвёрдым намерам знайсці і пакараць сваіх блудных сыноў сам адправіўся ў Афіны. Адшукаўшы ўцекачоў, не маючы найменшай цікавасці да філасофіі, паслухаў Дыягена і.... сам назаўсёды застаўся ў Афінах.

•

Дыяген бываў паўсюль: і на агоры, дзе жыла арыстакратыя, і ў бядняцкіх кварталах, заходзіў у храмы і паркі, на стадыёны і ў гавані, у тэатры і лазні. Яго можна было пабачыць і ў прытонах, у карчмах і бардэлях. Ён гутарыў з матросамі і гетэрамі, наёмнікамі і рабамі. Яго часта папракалі за гэткую неразборлівасць, на што філосаф адпавядаў:

— Сонца зазірае і ў ямы з гноем, але не апаганьваецца.

•

На пытанне «Якая розніца паміж чалавекам адукаваным і неадукаваным?» Арыстоцель адпавеў: «Як паміж жывым і мёртвым».

Выхаванне ж ён называў у шчасці ўпрыгожваннем, а ў няшчасці — прытулкам.

•

Дыяген жыў у велізарным піфасе, які перш выкарыстоўваўся для захоўвання віна. Ён пісаў жыхарам сваёй роднай Сінопы, адкуль быў выгнаны (нібыта за падробку грошай): «Вы прыгаварылі мяне да выгнання, а я вас — заставацца дома... Лепей жыць, дзе давядзецца, чымся з людзьмі, якія са мной гэтак учынілі».

•

Дэмакрыт казаў: «Цудоўная ўва ўсім сярэдзіна. Мне не па душы ні лішак, ні недахоп, а калі перадаць меру, той самае прыемнае стане непрыемным».

•

Ён жа казаў, што беднасці ў дэмакратычнай дзяржаве трэба аддаць перавагу над шчаслівым жыццём у манархіі нагэтулькі ж, наколькі свабода лепшая ад рабства.

•

Пратагор быў першым з грэцкіх мудрацоў, які браў грошы ад слухачоў за ўрокі, за што атрымаў мянушку «Платная мова».

Вышукаў А.ДЫШЛЕВІЧ.

І смех і грэх

Прэса-куламеса

Не бярэ падазронага!

«...спачатку браў малымі порцыямі тое, што дрэнна ляжала і не выклікала *падазрэнняў*».

«Літаратура і мастацтва».

Як справы ў парламенцах?

«Адбыліся таксама сустрэчы Мечаслава Грыба са старшынёй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Х.Марцінесам і прэзідэнтам *Міжпарламенцага* саюза Ж.Карніенам».

«Звязда».

Пазалітаратурная лексіка на фуршэце журналістаў

«Ожидаемая острая дискуссия на тему «пресса и власть» свелась в итоге к слаженному исполнению на фуршете песни «Как бы мне, рябине, **у дубу** перебраться».

«Имя».

Перліны «Ва-банка»

«**Перец** глазами всё расплывалось».

«Подростки **обажают** «зубодробительные» боевики».

«**потокая** своим страстям...».

«*Ф.Филлини*. «Восемь с половиной».

Аб'явы «Ва-банка»

«**Облицавка** качество».

«!!! Чудо от выпадения волос из женск. **плаценты**!!»

«**Батонический** сад, саженцы плодоносящих лимонов».

Пародыі

«Амсціслаўская плеяда» жартавала

У другой палавіне 20-х гадоў у Мсціслаўскім педтэхнікуме віравала літаратурнае жыццё. Горача абмяркоўваліся літаратурныя навінкі, наладжваліся дыспуты, спрэчкі, выдаваўся рукапісны часопіс. Многія навучэнцы спрабавалі свае сілы ў літаратуры. Тут вучыліся З.Астапенка, Ю.Таўбін, А.Куляшоў, якія шчыра сябравалі і якіх К.Крапіва ахрысціў «амсціслаўскай плеядай». Вучоба ў педтэхнікуме пакінула ў іх жыцці незабыўны след. Цеснае сяброўства працягвалася і ў Менску. Яны нярэдка пісалі мастацкія творы пад рознымі псеўданімамі. Некаторыя псеўданімы мелі непасрэдныя адносіны да месца іх нядаўняй вучобы. У прыватнасці, псеўданімам ***Мсціслаўцы*** *яны ўтраіх падпісалі пароды.* ***Амсціслаўцы*** *— гэта псеўданім Ю.Таўбіна і А.Куляшова.*

МСЦІСЛАЎЦЫ

Пародыя на сябравы творы

Сяргей Фамін

У дымным жыце

Пад звон сярпоў
нямала пераджыта.
На вёсцы жучкі трактар сцерагуць.
Закрасавала на балоце жыта
І канюшына з трыерам растуць.

Люблю — катоў, сабак
і ўсіх жывёлаў.
У дымным жыце шчыра іх люблю.
У Беларусі — тысяча Міколаў,
Два Сяргеі і адзін Паўлюк.

Хай паачысцяць трыеры насенне!
Пасеклі бор у снежную зіму.
... Люблю цябе я, вольная Расея,
А Беларусь ляпей...
Не ведаю чаму.

АМСЦІСЛАЎЦЫ

Гэта не змусоленае шчасце,
Гэта не гнілое забыццё...
Недзе за Уралам ігальчастым
Я праводзіла сваё жыццё...

Зінаіда Бандарына.

У Менск прыехала —
у Менску жарка,
Увечары тут спевы і кастры.
І нясуць жыццё сваё і арфу
За сусветную свабоду змагары.

Сем братоў запальваюць аковы.
Свісласпціць. Будуюць новы мост.
На «алтар сучаснасці руж овай»
Хтось халтуру новую прынёс.

Гары, гары ясна,
пакуль не пагасла.

Валерый Маракоў.

Так...
Я гарэў...
Пылаў у парываннях,
Калі цвіла рабінавая ноч...
Крычалі качкі
Ў жніўеньскім тумане,
Ў гарачы вечар
Тлелі за вакном.
Гару сягоння я,
Гарэў і ўчора...
Ах, да гарэння гэтак я ахвоч...
Дзівіўся чорт,
Нібы Шукайла з гора,
Чытаючы «Рабінавую ноч».
І месяц плыў,
І плакаў — я, Валеры,
Хацелася задумацца...
Кахаць...
Хай не адчыняць мне
ў прыгожым доме дзверы, —
І на Савецкай можна начаваць...

Публікацыя Г.ЮРЧАНКІ.

ДУМАЙ

Трэці закон Чызхалма:

Любыя прапановы людзі разумеюць інача, чымся той, хто іх уносіць.

Такім чынам (Наступствы):

1. Нават калі ваша тлумачэнне настолькі яснае, што выключае ўсялякае двухсэнсоўнае ці няправільнае, усё роўна знойдзецца чалавек, які зразумее вас няправільна.
2. Калі вы ўпэўненыя, што ваш учынак сустрэне ўсеагульнае адабрэнне, каму-небудзь ён абавязкова не спадабаецца.

Гумар маёй вёскі

Недзіцячая разважлівасць

Вясною трэба падрэзаць дрэўцы ў садзе. Як на тое ліха, згубілася недзе нажоўка. Клікаю суседскага хлопчыка Іванку, прашу: «Збегай да дзядзькі Адама, хай дасць нажоўку на паўгадзіны». Чакаю паўгадзіны, гадзіну. Іду сам да Адама, бяру тую нажоўку, зразаю засохлыя галінкі. Бачу, як бачком-бачком насоўваецца мой «пасыльны». Пытаюся:

— Чаму ж ты, Іванка, не прынёс мне нажоўку?

Той сціпла прамовіў:

— А я падумаў: прыйду да дзьдзькі, а яго не будзе дома...

Кароткая памяць

Настаўніца вышэйшай катэгорыі, кіраўнік раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў-прадметнікаў, пайшла на пенсію. Праз год тэлефануе ў інспектарскую аддзела асветы, прадстаўляецца.

— Хто-хто гэта звоніць? — здзіўлена перапытваюць на другім канцы провада.

— Хутка ж вы забываеце сваіх нядаўніх педагагічнай працы! — пакрыўдзілася ўжо маладая пенсіянерка, зноў паўтараючы сваё прозвішча.

— Прабачце, — дружалюбна пачулася з інспектарскай. — Мы пераважна запамінаем тых, каго лаялі пры праверках...

Эдзікі-суседзікі

Служыў у міліцыі малодшы лейтэнант Эдзік. Аднойчы ён пад'ехаў на службовай машыне дамоў з двума таварышамі па працы, хапатліва забег за нечым да сябе ў кватэру. Сусед па лесвічнай пляцоўцы — трохгадовы хлапчук, — зірнуўшы ў акно, у здзіўленні паклікаў маці:

— Мама, глянь: там з дзядзем Эдзікам яшчэ два Эдзікі прыехалі...

«Забойная» любоў

— Каго ты больш любіш: мяне ці тату? — пытаецца ў маленькай дачушкі мама.

— Цябе, цябе больш! — песціцца дзяўчынка.

— Ну, а як ты мяне больш любіш? — карціць даведацца цікаўнай маці.

— Я цябе, мамулька, так люблю, так люблю, як па тэлеку тых, каго забіваюць.

«Наматыкаваўся»

— От і наматыкаваўся я сёння! — задаволена пагладжваючы жывот і выходзячы з-за стала, сказаў тата пасля сытнага абеда.

— Татачка, а дзе ж тая матыка? — здзіўлена запытала двухгадовая дзяўчынка, азіраючыся па баках.

Падслухаў і даслаў Леанід РАМАНЕНКА, настаўнік - ветэран Рамельскай СШ.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1. Тэлефон: 33-17-83.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп.
Адказны сакратар Здзіслаў Сіцька.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 5777

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, г.Менск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 4551 паасобнік.
Падпісана ў друк 13.11.1995 г.
у 15 гадзін.